Працэс контр-рэвалюцыйнай арганізацыі меншавікоў-інтэрвэнтаў

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Год выдання—XV
№ 62 (3966)
ЧАЦЬВЕР, 5 САКАВІКА
1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

На сродкі „Торгпрома“ і II Інтэрнацыяналу

сацыял-здраднікі прабавалі аднавіць у СССР уладу фабрыкантаў і памешчыкаў

Магутны прыток у партыю Леніна лепшых ударнікаў гораду і вёскі—вось адказ пралетараў БССР меншавікам-шкоднікам

Бальшавіцкая зброя ў барацьбе за суцэльную калектывізацыю

Апублікаваныя тэзісы дакладу тав. Якаўлева да Усесаюзнага зьезду саветаў маюць вялізарнейшае палітычнае значэньне.

Яны падводзяць вынікі гістарычнай барацьбе пралетарыяту і мільённых бядняцка - серадняцкіх мас пад кіраўніцтвам ленінскай партыі за справу суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыю кулацтва як клясы.

Яны намячаюць бальшавіцкую праграму разгорнутага будаўніцтва сацыялізму ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

«Калі мы будзем, — гаварыў Уладзімер Ільіч, — сядзець па-старому ў дробных гаспадарках, хоць і вольныя тремадзяне на вольнай зямлі, нам усё роўна пагражае нямінучая пагібель».

Партыя цьвёрда запомніла гэтыя словы свайго правадыра і арганізатара, выражаючы непахісную волю рабочай клясы і асноўных мас сялянства.

Наперакор жорсткаму супраціўленню кулацкіх ворагаў, наперакор «проискам» міжнароднай контр-рэвалюцыі ад французкага генеральнага штабу да паноў меншавікоў з II-га сацыял-фашысцкага Інтэрнацыяналу здраднікаў, наперакор шкодніцтву агентаў інтэрвэнцыі ў нашай краіне—Рамзіных, Громанаў, Шарэраў і беларускіх нацыянал-дэмакратаў, наперакор капітулянцтву рэнегатаў рабочай клясы — правых і «левых» апартуністаў, — мы рабіліся непамерна вялізарных перамог у справе сацыялістычнай рэконструкцыі вёскі.

Якія яны, гэтыя перамогі?

Вычарпальны адказ на гэта пытаньне даюць тэзісы тав. Якаўлева, якія ярка характарызуюць вынікі калгаснага руху за мінулыя гады. І галоўнае ў гэтых вынніках заключаецца ў тым, што шлях суцэльнай калектывізацыі, шлях калгасаў «праверан мільёнамі сялян на ўласным вопыце і ацэнен імі, як адзіны шлях, які вызваляе іх ад кулацкай кабалы і вядзе да свабоднага калгаснага жыцьця».

Да Ўсесаюзнага зьезду саветаў краіна дыктатуры пралетарыяту прышла, маючы ў калгасах 33% усіх бядняцка-серадняцкіх сялянскіх гаспадарак СССР. Асноўныя збожжавыя раёны Саюзу цьвёрда сталі на шлях блізкага завяршэньня суцэльнай калектывізацыі. У іх, як паказваюць тэзісы, на 20-га лютага калектывізавана 67% усіх гаспадарак. У спажываючай паласе і нацыянальных раёнах процант калектывізацыі бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак дасягае 19. Ці-ж гэтыя лічбы не даюць непахісную веру ў тое, што задача, пастаўленая вераснёўскай адозвай ЦК УсеКП(б),—да канца трэцяга году пяцігодкі калектывізаваць ня менш 50% усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак,— ня толькі будзе выканана, але і перавыкананa. Ці-ж гэтыя лічбы не зьяўляюцца яркім доказам, што мы з посьпехам ажыцьцяўляем гістарычную задачу завяршэньня суцэльнай калектывізацыі да канца пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва.

Ужо ў першую калгасную вясну для асноўных мас сялянства сталі відавочнай ісьцінай перавагі калектыўнай гаспадаркі перад дробнай, аднаасобнай. Бо калгасы, яшчэ ня маючы патрэбнага вопыту, ужо тады па-бальшавіцку правялі першую калектыўную сяўбу, значна апярэдзіўшы аднаасобнікаў. Бо потым ураджай у калгасе на 10-15% перавысіў ураджай у аднаасобнай гаспадарцы. Бо вынікі першага году калектыўнай працы мелі фактаў і лічбаў паказалі, што прыбытак калгасьніка ў некалькі раз больш, чым прыбытак аднаасобніка. Гэта тлумачыцца тым, што:

«Калгас ёсьць буйная ўграмаджаная гаспадарка, якая мае магчымасьць прыстасоўваць і непш скарыстоўваць трактары, с.-г. машыны і г. д. у той час, як аднаасобная гаспадарка ёсьць дробная гаспадарка, пазбаўленая гэтай магчымасьці».

Гігантскія посьпехі індустрыялізацыі даюць магчымасьць пралетарскай дзяржаве ў 1931 г. значна «павялічыць у параўнаньні з 1930 г. дапамогу калгасам». 120 тыс. трактараў, 1.040 новых МТС, апрача існуючых, «падвоенае забесьпячэньне сельскай гаспадаркі і калгасаў с.-г. машынамі (на суму 768 млн. руб. замест 400 млн. р. у мінулым годзе)», —такі ўклад сацыялістычнай індустрыялізацыі ў сацыялістычную рэконструкцыю сельскай гаспадаркі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі. 1.050 млн. руб., якія адпускаюцца калгасам і МТС у 1931 г., — падводзяць магутную фінансавую базу пад справу далейшага разгортваньня суцэльнай калектывізацыі.

Гэтыя калгасныя перамогі калгаснага руху па-новаму паставілі пытаньне аб суадносінах клясавых сіл у вёсцы. У тэзісах тав. Якаўлева гэта мысль займае адно з цэнтральных месц.

Апошняя апора капіталістычнай эксплёатацыі ў вёсцы — кулацтва «асуджана і будзе ліквідавана» (І. Сталін). Серадняк у калгасе—гэта ўжо ня толькі былы саюзьнік рабочай клясы ў яе змаганьні за перамогу сацыялізму. Серадняк-калгаснік «разам з калгаснікам—былым батраком і бядняком — ператвараецца ў сапраўдную і магутную апору савецкай улады ў вёсцы». Ці варта гаварыць, якое вялізарнае значэньне мае гэты факт для справы будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне, для яшчэ большага ўмацаваньня дыктатуры пралетарыяту, для пасьляховай пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі СССР у трэцім годзе пяцігодкі.

«Тым самым у найвялікшай меры ўзмацняецца змычка рабочай клясы з сялянствам, пашыраецца фундамант рабоча-сялянскай улады, для якое з гэтага часу асноўнай і галоўнай апорай у вёсцы зьяўляецца калгаснае сялянства».

Гэтыя калгасныя перамогі калгаснага руху па-новаму ставяць пытаньне перад аднаасобнікам, які яшчэ ня ўступіў у калгас. Цяпер перад бедняком і серадняком-аднаасобнікам, які яшчэ ня ўступіў у калгас, «паўстала асноўнае пытаньне — за ці супроць калгасу».

Асноўныя бядняцка-серадняцкія масы аднаасобнікаў сваю думку ўжо цьвёрда і беспаваротна сказалі. Асноўныя масы аднаасобнікаў адказваюць на гэта пытаньне — так, мы за калгасы, мы, сёньнешнія аднаасобнікі, заўтра будзем у калгасе.

Асноўныя масы аднаасобнікаў, якія яшчэ сёньня стаяць па-за калгасамі,—за справу суцэльнай калектывізацыі, за справу рабочай клясы.

«Толькі той бядняк і серадняк-аднаасобнік застаецца і надалей саюзьнікам рабочай клясы, хто разам з рабочай клясай дапамагае будаваць калгасы, хто падтрымлівае калгасны рух, хто дапамагае весьці рашучую барацьбу з кулацтвам».

І самой зразумела, што аднаасобнік, які дапамагае кулацтву ў яго барацьбе супроць калгаснага руху, што аднаасобнік, які тармозіць калектывізацыю і прабуе падрываць калгасы,—не зьяўляецца такім саюзьнікам, што такі аднаасобнік—ёсьць памочнік кулака.

Дасягнутыя намі посьпехі калгаснага руху ня зьнімаюць, а наадварот, у некалькі раз павялічваюць задачу ўцягненьня аднаасобных бядняцка-серадняцкіх мас, што яшчэ засталіся, у калгасы. Якімі шляхамі? Не камандаваньнем, не адміністрацыйным націскам. Партыя і савецкая ўлада будуць сурова караць за найменшы рэцыдыў адміністраваньня, за ўсялякую найменшую спробу дакрэтаваць калгасны рух. Сёньнешнік аднаасобнікаў — бедняком і серадняком — мы павінны ўцягнуць у калгасы шляхам глыбокай растлумачальнай работы, шляхам паказу пераваг калектыўнай працы, шляхам пераканаўня фактамі перамог і дасягненьняў калгаснага руху, шляхам пераканаўня іх у тым, што шлях калгасаў ёсьць «адзіны шлях, які вызваляе іх ад кулацкай кабалы і вядзе да свабоднага калгаснага жыцьця». Гэта забясьпечыць перамогу, гэта забясьпечыць рашаючыя посьпехі ў справе ўцягненьня аднаасобных бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы.

Усё ўзрастаючы ўздым новага калгаснага прыліву, які знайшоў сваё адлюстраваньне ў бурным і магутным росьце сталінскага прызыву ў калгасы, — ці-ж трэба больш пераканаўчае сьведчаньне таго, што «новыя мільёны сялянскіх гаспадарак ужо вырашылі пытаньне аб тым, з кім ім ісьці — з рабочай клясай і ўсім калгасным сялянствам за калгасы ці з кулаком — супроц. калгасаў».

Новыя мільёны аднаасобнікаў, якія ўступаюць у калгасы ў адказ на спробы Рамзіных і Громанаў па загадзе французкага імпэрыялізму і меншавіцкага II-га Інтэрнацыяналу эрыйнаваць дыктатуру пралетарыяту агнём і мячом інтэрвэнцыі, заяўляюць, што яны—з рабочай клясай, што яны—з калгасным сялянствам за супроць кулака — гэтай апошняй апоры і надзеі міжнароднай буржуазіі.

— За ці супроць калгасаў?

За, адказваюць мільённыя масы аднаасобнікаў, усё вышэй і вышэй падніманючы сьцяг сталінскага прызыву ў калгасы. За, адказваюць яны, усё новымі і новымі масамі ўступаючы ў калектывы, цьвёрда, абедзьвюма нагамі становячыся на шлях сацыяльнай калектывізацыі. Тэзісы высоўваюць на першы план задачы далейшага ўмацаваньня калгасаў, задачы далейшага ўмацаваньня пралетарскага кіраўніцтва справай калектывізацыі, задачы рашучага разгортваньня кантрактацыі, як магутнага вагара калгаснага руху.

Тэзісы дакладу тав. Якаўлева — вострая бальшавіцкая зброя ў нашай далейшай барацьбе за суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю кулацтва як клясы на гэтай аснове. Яны павінны стаць эдабыткам найшырэйшых мас калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Яны павінны быць прапрацаваны ў кожным сельсавеце, калгасе, вёсцы. Яны павінны паслужыць практычнай праграмай нізавых арганізацый у барацьбе за бальшавіцкую падрыхтоўку да другой калгаснай вясны, за патраўненьне тэмпаў ВЫКАНАНЬНЯ ДАГАВОРАЎ СНК і ЦК АБ КАНТРАКТАЦЫІ, А ТАКСАМА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ІЛЬНАЗАГАТОВАК І ЎСІХ ЗАДАНЬНЯЎ УДАРНАГА МЕСЯЧНІКА ЗАГАТОВАК.

Бо трэба-ж проста сказаць, што ход падрыхтоўкі да сяўбы і разгортваньня кантрактацыі на сёньнешні дзень у нас, у БССР, зьяўляюцца зусім незадавальняючымі.

Няма сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў, няма яшчэ патрэбнай энэргічнай падрыхтоўкі. Пануе яшчэ ў цэлым радзе раёнаў правааапартуністычная стаўка на самацёк. Арганізацыя новага калгаснага прыліву на многіх кліцах адарвана ад падрыхтоўкі да сяўбы і наадварот. Многія раёны механічна перакінулі ўсе свае сілы толькі на арганізацыю новага прыліву, зусім забыўшы і выпусьціўшы з-пад увагі, што гэта важнейшая задача неадлучна ад падрыхтоўкі да сяўбы, што барацьба за новы калгасны прыліў павінна быць у тойжа час барацьбой за ўдарную падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны. Таксама, як падрыхтоўка да вясны павінна быць арганічна зьвязана з арганізацыяй новага ўздыму калгаснага прыбою. Так, і толькі так стаіць пытаньне. Так, і толькі так павінны працаваць усе раённыя арганізацыі.

Папулярызацыяй і ажыцьцяўленьнем тэзісаў тав. Якаўлева, яшчэ большым уздымам сталінскага прызыву ў калгасы, бальшавіцкім разгортваньнем кантрактацыі і падрыхтоўкай да сяўбы мы нанесем сьмяротны ўдар паном інтэрвэнтам і іх халопам — Рамзіным, Громанам, Суханавым, Лёсінам і Н.

Згуртаванымі радамі пад кіраўніцтвам ленінскай партыі вышэй тэмпы барацьбы за новы калгасны прыліў, за бальшавіцкую сустрэчу другой калгаснай вясны.

Неабходнасьць узброенай інтэрвэнцыі—

вось што аб'яднала меншавікоў з іншымі контр-рэвалюцыйнымі арганізацыямі

(Вячэрняе пасяджэньне трэцяга сакавіка 1931 году)

Вячэрняе пасяджэньне адкрываецца ў 6 гадзін 20 хв.

Суд пераходзіць да трэцяга моманту сьледзтва — блёку контр-рэвалюцыйнай арганізацыі меншавікоў з другімі контр-рэвалюцыйнымі арганізацыямі—«прампартыяй» і буржуазнай кулацкай групай Кандрацьцева-Чаянава.

Падсудныя спачатку прабуюць даказаць, што блёк быў толькі частковы. Ня гледзячы на сумесную шкодніцкую работу, на рэгулярнае фінансаваньне «саюзнага бюро» з боку «прампартыі», меншавікі прабавалі захапіць ліды нейкае адмежаваньне. Аднак т. Крыленка, пры дапамозе іх-жа паказаньняў, даказвае, што меншавікі поўнасьцю згаджаліся з «прампартыяй» у неабходнасьці ўзброенай інтэрвэнцыі. Громан пры гэтым па-

200.000 руб. ад „прампартыі“— за „працу“

Наступны момант, найбольш «шчакотлівый» — гэта пытаньне аб фінансаваньні «саюзнага бюро». Агульная сума, атрыманая «саюзным бюро» ад «прампартыі», з г. зн. і ад «Торгпрома», складае 200.000 р. Падсудны Гінзбург ад гэтай тэмы стараецца ўхіліцца, заяўляе, што ў гэтым падрабязнасьці не ўваходзіў. Але Громан і Якубовіч падрабязна выкладаюць ход шкодніцкай работы ў асобных галінах прамысловасьці, паведамляюць аб разьмерах таго шкодніцтва, якое аплачвалася поўнацэнным манэтай. Роля і мэты дакладна разьмеркаваны. Меншавікоў кантраляваала «прампартыя». З гэтай мэтай склікаліся спэцыяльныя аб'яднаныя пасяджэньні, на якіх Гінзбург рабіў справаздачу аб дзейнасьці «саюзнага бюро» перад «гасподарамі», якія аплачвалі яго працу. Падсудны Суханаў, гаворачы аб сваіх адносінах да блёку з «прампартыяй», прабуе прадставіць справу ў такім выглядзе, што ён да гэтага блёку адносіўся адмоўна. На «прампартыю» ён глядзеў ня толькі як на ўнуючую партыю дыктатуры капіталу, але і як на арганізацыю, якая на справе магла аказацца манархічнай, фашысцкай і нават шпіёнскай.

Таму ён прадстаўнікоў «прампартыі» да сваёй арганізацыі не дапушчаў. Але ў той-жа час дзьверы блёкады аказаліся шырока адчыненымі для тых элемэнтаў, з якіх згуртаваўся адзіны контр-рэвалюцыйны блёк. Аднак, як Суханаў прызнае, што чыстата прынцыпаў не перашкодзіла на справе яму, як члену «саюзнага бюро» ЦК меншавікоў, вельмі хутка апынуцца ў блёку з «прампартыяй».

Допыт сьведкі Рамзіна

Былы кіраўнік «прампартыі» Рамзін ва ўсіх дэталях пераказаў гісторыю ўзаемаадносін сваёй арганізацыі і меншавіцкага «саюзнага бюро». Блізкасьць паміж «прампартыяй» і меншавікамі ўстанавілася з 1926 году, спачатку на глебе агульнай шкодніцкай работы пры складаньні пяцігадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі і кантрольных лічбаў.

Меншавікі сваю шкодніцкую пазыцыю, паводле слоў Рамзіна, апраўдвалі такімі меркаваньнямі: імкненьне савецкай улады пабудаваць сацыялістычную гаспадарку нямінуча асудзана на няўдачу, а таму неабходна штучным шляхам скараціць тэрмін скапчэньня пяўдалага вопыту. Кіраўнікоў «прампартыі» ідэалёгічнае згуртаваньне, якое высоўвалі меншавікі, мала займала. Іх значна больш займалі практычныя вынікі і тая каштоўнасьць у адносінах арганізацыі шкодніцкай работы, якую прадстаўлялі меншавікі, якія займалі рад камандных пастоў у некаторых важнейшых галінах народнай гаспадаркі. Пад націскам усё тэй-жа «нямінучасьці» меншавікі прынялі ўсталёўку на інтэрвэнцыю, якая рыхтуецца, і ўстанаўленьне пасьля перавароту ваеннай дыктатуры.

Рамзін ва ўсіх падрабязнасьцях асьвятліў асобныя спатканьні, гутаркі і афіцыяльныя перагаворы паміж прадстаўнікамі «прампартыі» і меншавіцкага «саюзнага бюро» і ТКП, якія ў канчатковым выніку прывялі да фармальнага блёку гэтых трох контр-рэвалюцыйных арганізацый.

Парыскі «Торгпром» вітаў заключэньне блёку і фінансаваў яго. Праз Ларычава меншавіцкае «саюзнае бюро» ў розны час атрымала каля 200-250 тыс. руб. са сродкаў, асыгнаваных «Торгпромом» на вядзеньне контр-рэвалюцыйнай работы ў СССР.

Допыт сьведкі Ларычава

Сьведка Ларычаў паказвае, што блёк «саюзнага бюро» з «прампартыяй» дыктаваўся самай сілай справы: калі шкодніцтва з прамысловасьці пачало пераносіцца, галоўным чынам, у плянавую галіну, то ўнуючым чынам, у плянавую галіну, то для «прампартыі» стала відавочна неабходнасьць сувязі з контр-рэвалюцыйна-настроенымі эканамістамі.

Допыт падсудных Громана і Фін-Енатаеўскага

Падсудны Фін-Енатаеўскі расказвае фінансавым зьвяном з заграніччным цэнтрам і «саюзным бюро».

Абвяшчаецца перапынак да 4-га сакавіка.

Пры складаньні перспэктыўных плянаў намячалася сувязь з Громанам і Гінзбургам, і такім чынам быў падрыхтован блёк да меншавіцкай арганізацыі.

На пытаньне тав. Крыленкі аб фінансаваньні «саюзнага бюро» Ларычаў, які ведаў фінансамі «прампартыі», указвае, што «саюзнаму бюро» было перадана 200.000 руб. «Торгпромовских» грошай.

Фарпост Інтэрвэнцыі

МАЛ. Я. КАШКЕЛЯ.

Праграма меншавікоў з дадаткам Дэтэрдынга і II Інтэрнацыяналу

ПАТРАБУЕМ СУРОВАГА ПАКАРАНЬНЯ агентаў інтэрвэнцыі

Ператворым навуку у сапраўдную зброю сацбудаўніцтва

Акадэмічны савет Беларускай Акадэміі Навук ганьбіць выкрытую контр-рэвалюцыйную арганізацыю меншавікоў — агентаў сусьветнай буржуазіі, шкоднікаў, якія стварылі контр-рэвалюцыйную арганізацыю «саюзнае бюро» РСДРП (меншавікоў), дапамагаючы інтэрвэнцыяністкім плянам сусьветнага фашызму.

Бурныя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, ліквідацыя кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі выклікаюць ліхаманкавую падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць пераможнага будаўніцтва сацыялізму ў СССР. Непасрэднымі агентамі інтэрвэнтаў зьяўляюцца выкрытыя: «прампартыя», арганізацыя Кандрацьцева-Чаянава і «саюзнае бюро». Апошняе зьяўляецца сродкам у руках нятхнійцеля інтэрвэнцыі —II-га Інтэрнацыяналу.

Акадэмічны савет патрабуе самага жорсткага пакараньня агентаў інтэрвэнцыі і запэўнівае камуністычную партыю ў яшчэ большай згуртаванасьці вакол яе для ператварэньня навукі ў сапраўдную зброю сацыялістычнага будаўніцтва.

200 руб. у фонд абароны краіны—вось наш адказ меншавіцкай зграі

Члены прафсаюзаў Талочыншчыны рашуча пратэстуюць супроць агіднай контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці меншавіцкай групы Громана, Суханава і інш. і патрабуюць ад Вярхоўнага суда ў адносінах да апошніх самага жорсткага пакараньня.

У адказ на пропушкі меншавікоў — агентаў міжнароднай буржуазіі — калектыў рабочых абяцае яшчэ цясьней згуртавацца вакол камуністычнай партыі, павысіць ўсе сілы на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі, разгарнуць шырэй ударніцтва і сацспаборніцтва і ўмацаваць падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны.

На ўмацненьне абароназдольнасьці краіны рабочыя адказваюць узносам у фонд абароны 200 рублёў і масавым уступленьнем у рады Асоавіяхіму.

Чыгуначнікі абяшчаюць сябе мабілізаванымі

Агульны сход рабочых і служачых Менскага вузла МБВ чыгункі канстатуе: меншавіцкая шкодніцкая арганізацыя Громана, Суханава і інш. мела на мэце пры дапамозе імпэрыялістаў і II-га Інтэрнацыяналу зьвяржэньне дыктатуры пралетарыяту ў савецкай краіне.

У адказ на контр-рэвалюцыйную дзейнасьць меншавікоў чыгуначнікі абяшчаюць сябе мабілізаванымі на ліквідацыю прарываў на транспарце і абяцаюць яшчэ шырэй разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, абвясьцілі бязьлітасную барацьбу прагульшчыкам, рвачом і кідбайнікам.

Наладжваюць суботнік на дапамогу транспарту

У адказ на контр-рэвалюцыйную дзейнасьць меншавікоў-інтэрвэнтаў рабочыя і служачыя ст. Буда-Кашалёўская пастанаўляюць правесьці суботнік на дапамогу транспарту і далучыцца да пляновых рабочых аб выпуску пазыкі «Трэці рашаючы год пяцігодкі». Рабочыя і служачыя абяцаюць яшчэ мацней згуртаваць свае рады вакол камуністычнай партыі і перадаюць у яе рады 5 сваіх лепшых рабочых-ударнікаў.

Патрабуюць бязьлітаснага пакараньня

Агульны сход рабочых друкарні імя Сталіна ганьбіць меншавікоў-шкоднікаў — агентаў сусьветнага імпэрыялізму і патрабуе ад Вярхоўнага суда для ўсіх іх бязьлітаснай кары.

У адказ на шкодніцкую контр-рэвалюцыйную дзейнасьць меншавіцкай арганізацыі рабочыя абяшчаюць сакавік месячнікам па ліквідацыі прарываў, абяцаюць палажыць усе сілы на выкананьне прамфінпляну першага кварталу і пастанаўляюць шляхам арганізацыі новых ударных брыгад дамо вышэй узьняць сьцяг сацыялістычнага сяўбаніцтва.

Прымаем выклік данецкіх рабочых

Курсанты і начскład палкавой школы Н-скага ўдарнага стрэлковага палка выказваюць глыбейшае абурэньне ажыдкай контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай дзейнасьцю меншавіцкай арганізацыі на чале з Громанам, Суханавым, якая ў гуўзе з «прампартыяй», кулацкай партыяй Кандрацьцева, «Торгпромом», па загадах імпэрыялістаў і II-га Інтэрнацыяналу, імкнулася да зьвяржэньня савецкай улады шляхам узброенай інтэрвэнцыі.

У адказ на шкодніцкую, інтэрвэнцыяністкую дзейнасьць меншавікоў перадаем лепшых ударнікаў у тэрыторыю, прымаем выклік данецкіх рабочых і распачынаем папярэднюю падпіску на пазыку «Трэці ірашаючы год пяцігодкі».

Курсанты і начскład абяцаюць з яшчэ большай энэргіяй змагацца за перавыкананьне плянаў батальёнам падрыхтоўкі, змагацца за сапраўды прыкладную школу.

Адначасова курсанты і начскład патрабуюць ад Вярхоўнага суда самага жорсткага пакараньня для ўдзельнікаў меншавіцкай контр-рэвалюцыйнай арганізацыі.

**

Студэнты Менскага політэхнікуму суровага ў адказ на контр-рэвалюцыйную дзейнасьць меншавіцкай арганізацыі Громана, Суханава і інш., якая разам з II Інтэрнацыяналам і сусьветным імпэрыялізмам шляхам узброенай інтэрвэнцыі і шкодніцтва імкнулася сарваць сацыялістычнае будаўніцтва і вынішчыць першую ў сьвеце бальшавіцкую міжнароднага пралетарыяту, — заяўляюць:

Правесьці энэргічную работу па арганізацыі вытворча-бытавых камун, зьнішчыць непасьляховасьць у вучобе, узьняўшы яе на належную вышыню, а таксама ўзьняць дысцыпліну і палітычны ўзровень усіх курсантаў.

Павялічым рады ўдарнікаў

Рабочыя, служачыя і тэхнічэскі аршанскага Ільнакамбінату а абурэньнем пратэстуюць супроць шкодніцтва меншавіцкай контр-рэвалюцыйнай арганізацыі—Громана, Шэра, Іваева, Суханава і інш., якія пад кіраўніцтвам сацыяль-фашыстаў з II-га Інтэрнацыяналу падрыхтоўвалі інтэрвэнцыю супроць СССР.

У адказ на брахню цьвёрдалобай зграі і яе пёкнаў сацыял-фашыстаў аб «прымусовай працы» павялічваем рады ўдарнікаў на 30 чал., замацоўваем сябе ў прадпрыемстве да канца пяцігодкі, адпрацуем адзін выхадны дзень у карысьць прадпрыемства на ліквідацыю студзеньскага прарыву на нашым прадпрыемстве, павялічым рады кампартыі і камсамолу.

Мы просім савецкі суд прыцягнуць вышэйпаказаных контрэвалюцыянэраў з «саюзнага бюро» да вышэйшай меры сацыяльнай абароны, каб яшчэ адзін ахвяру ў іншых ворагаў нашага будаўніцтва ад шкодніцтва у нашым Сацыялістычнае.

Сацыял-інтэрвэнты і правы апартунізм

Пачаўся працэс над сацыял-шкоднікамі, якія за грошы «Торгпрома» і II Інтэрнацыяналу падрыхтоўвалі інтэрвэнцыю супроць Савецкага Саюзу. Увага рабочых і працоўных Савецкага Саюзу і ўсяго сьвету накіравана да Капённай залі саюзаў, дзе пралетарскі суд выкрывае ўсю контр-рэвалюцыйную, шкодніцкую дзейнасьць меншавікоў, усю контр-рэвалюцыйную дзейнасьць II інтэрнацыяналу. Правільна адзначыў орган нашай брацкай нямецкай партыі «Ротэ Фанэ», што на паве падсудных сядзіць II Інтэрнацыянал, які выкрыт, як прадажны, наёмны атрад міжнародных эксплёататараў.

Пралетарскі суд бязьлітасна распраўцца з гэтымі меншавікамі-інтэрвэнтамі, якія за 960.000 рублёў юдавых срэбнікаў прабавалі арганізаваць голад для рабочых і працоўных, паводзілі шкодніцкую работу, падрыхтоўвалі інтэрвэнцыю імпэрыялістаў. Рабочыя і працоўныя масы зробяць усе вывады з гэтага працэсу.

Правы апартунізм выкрыт нашай партыяй, як агентура кулацка-капіталістычных элемэнтаў, які цягнуў партыю на шлях капіталістычнай рэстаўрацыі. Матар'ялы аб контр-рэвалюцыйнай рабоце меншавікоў кідаюць новы прамень сьвятла на сацыяльна-палітычныя вытокі права-апартуністычных тэорый і поглядаў. Яны яскрава паказваюць глыбіню ўсёй небясьпекі, якую ўяўляе сабой правы апартунізм для нашай партыі, для сацыялістычнага будаўніцтва.

Нездарма меншавікі арыентаваліся на падтрыманьне правых. Іх нутро абаронцаў капіталізму гаварыла мі, што правыя апартуністы пойдуць па тым-жа шляху, што і трацкісты, канчаткова скоцяцца, як і першыя, у сацыял-дэмакратычнае балота. Яны добра бачылі куды вядуць шляхі, якія прапанавала правая апазыцыя.

Таму ЦК меншавікоў даў дырэктыву аб падтрыманьні «ўсіх праектыровак, што выхопяць ад правай апазыцыі», аб «усялякім падтрыманьні правай апазыцыі і разьвіцьці яе тэндэнцый у бок павароту сацыял-дэмакратызму».

Мы маем у наяўнасьці чульлівую ідылію супрацоўніцтва паміж правым ухілам у партыі і меншавіцкай контр-рэвалюцыяй. Справа зводзіцца ня толькі да таго, што меншавікі падтрымлівалі правых апартуністаў. Больш таго, правыя апартуністы бралі на пракат у меншавікоў іх «тэорыі» і «тэорыйкі», пакрываючы іх мішурой быццам-бы камуністычных фраз.

Правыя апартуністы выступалі за зьніжэньне тэмпаў індустрыялізацыі. Яны высунулі канцэпцыю затухаючай крывой, паводле якой прадукцыйнасьць працы, рост сацыялістычнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі павінен быў усё больш і больш зьнікацца. Зараз мы бачым простую крыніцу гэтай хвалі, гэтай затухаючай крывой. «Шкодніцтва выявілася ў тым, што рост прадукцыі ўсіх галін вытворчасьці, узятых у сумесным статыстычным выражэньні на працягу пяцігодкі, сьведома быў запраектаван ніжэй, чым патрэбна было і можна было». (Паказаньні сацыял-шкодніка ГІНЗБУРГА).

Правыя апартуністы высоўвалі ідэю двухгодкі нібы для ліквідацыі затрудненьняў. У абвінаваўчым заключэньні названы бацькі і стваральцы гэтай ідэі. Сацыял-шкоднік Громан проста гаворыць: «Наша трактоўка пытаньня дала базу для ідэі двухгодкі з сельска-гаспадарчым ухілам, якая ў корані пярэчыць пляну сацыялістычнай перабудовы вытворчых адносін у СССР».

Тэорыя мірнага ўрастаньня капіталістычных элемэнтаў у сацыялізм, якая зьяўляецца квінт-эсэнцыяй правага апартунізму, якая найбольш яскрава паказвае кулацкую сутнасьць правага ўхілу, узяйшла ў жалезны арсэнал меншавіцкай контр-рэвалюцыйнай агітацыі. Тэорыя «ўрастаньня», якая «ва ўмовах» буржуазнага ладу была правай самага поганага віду рэфармізму, апартунізму, рэнэгацтва... па гэты бок рэвалюцыі стала пёзунгам сацыялістычнага будаўніцтва». Гэта гаворыць адзін з правадыроў меншавіцкай арганізацыі —Суханаў.

Правыя апартуністы сустрэлі ў штыхі паварот партыі да рушачага наступленьня на капіталістычныя элемэнты. Гэта яны гаварылі, што партыя і яе ЦК зноў паварачваюць да ваеннага камунізму. Лідэры правага ўхілу пераказвалі, абаранялі агідныя паклёпы «Социалистического вестника», і аб'ектыўна праводзілі дырэктывы, якія замежны цэнтр меншавікоў пасылаў сваім агентам у Савецкім Саюзе. У абвінаваўчым заключэньні мы знаходзім вымест дырэктыўнага ліста замежнага цэнтру у якім гаворыцца, што «бальшавізм павярнуў на шлях ваеннага камунізму, які нясе з сабой новую гапечу краіне, гаспадарчую разруху і ўзмацненьне тэрору».

І ня толькі ў тэорыі, але ў мэтадах сваёй работы правыя апартуністы падобны, як блізьняцы, на сацыяль-шкоднікаў. Меншавікі ў мэтах падрыхтоўкі інтэрвэнцыі праводзілі шкодніцтва ў нашай народнай гаспадарцы. Паводле паказваньняў меншавіка Пятуніна, «сутнасьць шкодніцкай работы заключалася ў тым, каб былі ўзяты такія тэмпы, якія-б не патрабавалі напружаньня, з гэтай мэтай налічваліся паменшаныя маг[illegible] матар'яльных і фінансавых рэсурсаў». Характэрнай рысай правых апартуністаў зьяўляецца імкненьне, каб разьвівацца і працаваць без напружаньня, «тихой сапой».

Правы апартунізм у іншых сэкцыях Камінтэрну зьяўляецца таксама агентурай сацыял-дэмакратыі ў радах камуністычных партый. Гэта навочна выяўляецца ў адносінах да правай апазыцыі ў радах кампартыі Польшчы, на фоне апошніх падзей у варшаўскай арганізацыі. Тое, што рэнэгацкая група, якая прабавала раскалоць бальшавіцкія рады варшаўскай арганізацыі, напісала на сваім сьцягу імёны правадыроў правай апазыцыі кампартыі Польшчы—Варскага, Кастшэвы і Бартушэвіча, тое, што яны, гэтыя правыя апартуністы, становяцца цэнтрам, які прыцягвае антыпартыйныя сілы, які грае проста на руку фашызму, пепш за ўсё сьведчыць аб сутнасьці правага ўхілу, праваапартуністычнай групы ў КПП.

Партыя і Камінтэрн далі рашучы бой правому апартунізму. Правая апазыцыя ва ЎсеКП(б) разгромлена. Але правая небясьпека і ў далейшым зьяўляецца галоўнай. У адказ на контр-рэвалюцыйную дзейнасьць меншавікоў, на падрыхтоўку інтэрвэнцыі, партыя ў бязьлітаснай барацьбе на два фронты яшчэ больш узмоцніць адзінства і маналіт-насьць сваіх радоў,—асноўную ўмову пераможнага сацыялістычнага наступленьня і перамогі над сусьветным імпэрыялізмам у рашаючых набліжаючыхся баёх двух сьветаў.

РАЗАНАЎ—ЗДРАДНІК ПАРТЫІ*)

У матар'ялах працэсу праходзіць яшчэ адна асоба — гэта Д. Разанаў, здраднік партыі.

Нашы ворагі цяпер, калі Разанаў здрадзіў партыі, прабуюць прадставіць Разанава «старэйшым камуністам» і «сьветачам марксызму», яны хочуць у сваіх мэтах скарыстаць гэта здраднічтва.

Дарэмна. Наша партыя добра ведае палітычную біяграфію Разанава: добра вядома, што гэты «старэйшы» зьяўляецца не вельмі даўным камуністам, вядома таксама, што той, каго меншавікі прабуюць цяпер называць «сьветачам марксізму», зьяўляецца ўсяго толькі нязграбнай капцільнай лямпай.

Уладаючы вялізарнай эрудыцыяй і начытанасьцю, ён на працягу многіх гадоў быў у баку ад непасрэднай рэвалюцыйнай барацьбы. Яго дакладнае веданьне прац Маркса і Энгельса заставалася свайго роду мёртвым капіталам. Жывы, рэвалюцыйны, дзейсны дух марксызму быў заўсёды далёкім ад яго. У гэтых адносінах традыцыі II-га Інтэрнацыяналу, які імкнецца адарваць тэорыю марксызму ад рэвалюцыйнай барацьбы, ператварыць яе ў мёртвую схему і догму, знайшлі ў Разанава сваё закончанае ўцялесьненьне. Талмудыст, начотчык ад марксызму, але не марксыст — такая асноўная рыса Разанава.

На працягу ўсяго свайго палітычнага жыцьця ён носіцца біз руля і без вятрыл ад аднаго бер

ТРЭЦІ ГОД ПЯЦІГОДКІ

і перабудова партыйнай і масавай работы на прадпрыемствах*)

Мы ўступілі ў трэці рашаючы год пяцігодкі, у якім павінны завяршыць пабудову фундамэнту сацыялістычнай эканомікі Савецкага Саюзу. Гэта азначае, што мы павінны ў 1931 г. завяршыць рашаючую праблему пяцігодкі, ня толькі ў прамысловасьці і транспарце, але і ў сельскай гаспадарцы, перамагчы некаторыя «вузкія» вучасткі ў нашай гаспадарцы, якімі зараз зьяўляюцца хлеб, мэталь і транспарт і забясьпечыць пасьпяховае выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, а на радзе рашаючых галін (вугаль, нафта, машынабудаўніцтва, аўта-трактара-будаўніцтва, электратэхніка і інш.) за 3 гады. Вялізарнейшыя задачы пастаўлены партыяй у 3-м рашаючым годзе пяцігодкі: дабіцца прыросту прадукцыі прамысловасьці ў разьмеры роўным усёй даваеннай прадукцыі, 50 проц. калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх двароў у спрэднім па Саюзе і закончэньня ў асноўным калектывізацыі ў галоўных збожжавых раёнах Саюзу, вырашэньня ў асноўным праблемы жывёлагадоўлі, значнага ўзмацненьня тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі. Ажыцьцяўленьне ўсіх гэтых бістарычных задач патрабуе далейшай мабілізацыі усіх сіл партыі і рабочай клясы, рашучай мабілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў народнай гаспадаркі. Ці маем мы абэктыўныя ўмовы для выкананьня гэтых задач? На гэта мы можам даць выразны адказ т. СТАЛІН у сваёй прамове на Усесаюзнай канфэрэнцыі работнікаў прамысловасьці.

«Такія чынам для выкананьня пляну абэктыўныя магчымасьці ў нас ёсьць у наяўнасьці. Ці маецца ў нас другая ўмова—уменьне скарыстаць гэтыя магчымасьці? Інакш кажучы—ці ёсьць у нас правільнае кіраўніцтва фабрыкамі, заводамі і калгаснымі? Ці ёсьць тут добра. На жаль, ня ўсё тут добра. І мы, як большавікі, павінны гэта сказаць, проста і адкрыта».

Значныя абэктыўныя ўмовы, якія неабходны былі для поспаху выкананьня пляну першых 2-х год пяцігодкі ў нас былі, абэктыўныя ўмовы для выраўнаньня задач 3-га году таксама ёсьць. Недахопы і невыкананьне пляну мінулага гаспадарчага году асабліва на лініі якасных паказальнікаў адносяцца цалкам за лік пэдавальнічай арганізацыі кіраўніцтва вытворчасьцю і работай прамысловасьці, далёка нявыгадна скарыстаньня ўсіх вялізарных рэсурсаў Савецкай краіны. Таму задача лепшай арганізацыі кіраўніцтва вытворчасьцю, узьмацненьне работы гаспадарчых, партыйных і прафсаюзных арганізацый на новую вышыню, задача забясьпячэньня тэхнічнага кіраўніцтва прамысловасьцю, удасканаленьне тэхнікі кіруючымі гаспадарчымі работнікамі на прадпрыемствах набывае рашаючае значэньне ў сучасны зьрыў карэнной рэканструкцыі прамысловасьці. Вопыт выкананьня першых 2-х год пяцігодкі, дзілкія поспехі, якіх мы дасягнулі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, на падставе цьвёрдага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, бязьлітасная барацьба з правымі і «левымі» апартуністамі, кулацкай агэнтурай у радах партыі, паказваюць, што мы маем усе магчымасьці для поспаху ажыцьцяўленьня ўлікі 3-га рашаючага году пяцігодкі. Ва ўмовах БССР мы закончылі другі год пяцігодкі са значным перавыкананьнем пляну па валавой прадукцыі прамысловасьці, правялі рэканструкцыю большасьці старых прадпрыемстваў, а цэлы рад новых новых прадпрыемстваў ужо ўключылі ў навую сацыялістычную прамысловасьць. А ў галіне сельскай гаспадаркі і на сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі першых 2-х год пяцігодкі значна перавысілі плян усёй пяцігодкі, (пасяўная плошча саўгасаў павялічылася больш чым у 3 разы ў параўнаньні з 1927 г., 20 проц. пасяўной плошчы знаходзіцца пад калгасамі).

Выкарчоўваць апартуні'зм на шляху сацыялістычнага будаўніцтва

Гэтыя поспехі зьяўляцца лепшай праверкай правільнасьці генэральнай лініі партыі, лепшым адказам правым і «левым» апартуністам.

Рэканструкцыйны зрыў паставіў на ўсю шырыню перад партыяй, прафсаюзамі, саветамі і іншымі масавымі арганізацыямі пытаньне карэнной перабудовы работы гэтых арганізацый. Мы маем зараз усе падставы для таго, каб адзначыць поспехі ў галіне перабудовы работы партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый. Мы базуюўна маем паварот «тварам да вытворчасьці» з боку партыйных і прафсаюзных арганізацый. Праверка, якая праведзена ЦК у сувязі з падрыхтоўкай нарады сакратароў вытворчых ячэек, паказала, што партыйныя арганізацыі на прадпрыемствах за апошні зрыў адлажа асаблівую ўвагу пытаньням вытворчасьці і выкананьня прамфінпляну. Гэты паварот «тварам да вытворчасьці» маецца таксама і на лініі большасьці прафсаюзных арганізацый. Аднак, мы ня можам прайсьці міма таго факту, что ў галіне перабудовы работы партыйных і асабліва прафсаюзных арганізацый на прадпрыемствах назіраецца вялікае адставаньне. У аснове гэтага адставаньня базуюўна лежыць супрацьўленьне апартуністычных элементаў усё нарастаючым тэмпам нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Па радзе нашых прадпрыемстваў маецца апартуністычны самацёк, замест актыўнага правядзеньня ў жыцьцё дырэктыў партыі аб лепшай арганізацыі кіраўніцтва вытворчасьцю і належнага кіраўніцтва мазутным працоўным надзёмам мас. Гэтым і тлумачыцца тое, што ў мінулым гаспадарчым годзе наша прамысловасьць недавыканала пляну ў радзе галін, асабліва па якасных паказальніках. Недавыкананьне заданьня па зьніжэньні сабекошту на 3 проц., незадавальняючае становішча якасьці прамысловай прадукцыі, перабой у забясьпячэньні сырцом і аналам некаторых прадпрыемстваў—усё гэта гаворыць аб тым, што ў галіне гаспадарчага кіраўніцтва, а таксама партыйнай і прафсаюзнай работы ня ўсё добра. Неабходна асабліва падкрэсьліць, што ход выкананьня прамфінпляну ў першым квартале—у студзені і першай дэкадзе лютага 1931 г.—сьведчыць пам небяспецы сурʼёзных прарываў, якіх зараз-жа ня будуць прыняты энэргічныя меры да ліквідацыі тых асноўных недахопаў, якія давалі сабе адчуваць на працягу мінулага году. Гэтыя недахопы ў асноўным заключаюцца ў тым, што ва ўсіх галінах дырэктыва партыі аб лепшым выкананьні ўнутраных рэсурсаў на прадпрыемствах выконваецца слаба. Па-ранейшаму ня зьмяншаецца скарыстаньне рабочай сілы, жорсткая эканомія сырцу і аналу і г. д. зьяўляецца крыніцай гэтых рэсурсаў сацыялістычнай прамысловасьці. Неабходна зараз-жа ўзяцца з заўзятасьцю і «абломнасьцю», якую мы назвалі ў галіне ажыцьцяўленьня прынцыпу гаспадарчага разьліку, і правядзеньня адзіначальньня зьверху дакладу. Мы павінны з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю ажыцьцявіць дырэктывы партыі аб пераводзе на гаспадарчы разьлік ня толькі прадпрыемствам, але і цэхам і больш дробным гаспадарчым зьвеньням нашай прамысловасьці. Кампэрэнцыя работнікаў прамысловасьці зусім правільна падкрэсьліла, што «павышэньне ролі заводаў шляхам пасьлядоўнага правядзеньня гаспадарчага разьліку на ўсіх ступенях гаспадарчай арганізацыі» зьяўляецца сапраўдным сродкам павышэньня адказнасьці, ініцыятывы кожнай асобнай гаспадарчай адзінкі і рашучага палепшэньня гаспадарчага кіраўніцтва прадпрыемствамі.

Аўладаньне тэхнікай і рацыяналізацыя важнейшыя задачы дня

Цэнтральнай задачай, якая зараз мае выключнае значэньне ў барацьбе за выкананьне пляну 3-га рашаючага году, зьяўляецца пытаньне рацыяналізацыі і аўладаньне тэхнікай, гаспадарчым кіраўніцтвам, а таксама кіруючым партыйным і прафсаюзным актывам. «Трэба самім стаць сацыялістамі—гаспадарамі справы, давярнуцца тварам да тэхнічных ведаў» (з прамовы т. Сталіна на канф. работн. прамысловасьці).

Ацэньваючы работу кіруючых арганізацый на прадпрыемствах з гэтага боку, мы павінны падкрэсьліць, што пытаньні рацыяналізацыі не сталі ў цэнтры ўвагі гаспадарчых арганізацый. Таксама зусім мала займаліся гэтай справай партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі. Мы павінны дабіцца рашучага пералому ў першую чаргу ў партыйных арганізацыях на прадпрыемствах, мабілізаваць партыйную арганізацыю, ударнікаў і ўсю рабочую масу вакол задач рацыяналізацыі і аўладаньня тэхнікай, павінны дабіцца таго, каб гэты балны лёзунг партыі быў падхоплены мільённымі масамі рабочых. У гэтым ключ да вырашэньня складаных праблем гаспадарчага кіраўніцтва 3-га рашаючага году. Партыйным арганізацыям неабходна забясьпечыць адпаведныя ўмовы для таго, каб гаспадарчае кіраўніцтва, у першую чаргу, падвысіла сваю тэхнічную падрыхтоўку, у значнай меры разгрузіць ад лішніх насяджэньняў, непатрэбнай мітусьні, шматлікіх нямэтагодных абсьледаваньняў, забясьпечыць поўную магчымасьць дырэктару, майстру цэху і ўсім іншым гаспадарчым работнікам на прадпрыемствах вывучыць тэхніку вытворчасьці. Партыйныя арганізацыі на прадпрыемствах павінны стаць на чале, арганізаваць масавы рух за аўладаньне тэхнікай. Разгортваньне шырокай сеткі вячэрніх курсаў, школ на прадпрыемствах па тэхнічнай падрыхтоўцы, больш шырокае ўкараненьне тэхнічных ведаў у існуючыя рабочыя школы, шырокае разгортваньне работы на арганізацыі тэхнічных гурткоў, арганізацыя систематычнай работы на ўкараненьні тэхнічных ведаў пры клюбы і чырвоныя куткі, камплектаваньне бібліятэк на прадпрыемствах і рабочых клюбах тэхнічнай літаратурай—вось тыя першыя практычныя мэрапрыемствы, якія павінны быць праведзены безадкладна. Неабходна гэтай работе надаць шырокі размах, дабіцца павышэньня запікаўленасьці з боку ўсёй рабочай масы пытаньнямі тэхнікі, разгарнуць работу на арганізацыі на ўсіх прадпрыемствах ячэек Т-ва «Друзей тэхнікі». Ва ўсёй гэтай работе партыйныя, гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі павінны абапірацца на перадавую частку рабочых-ударнікаў.

Цэнтр цяжару партработы--у нізавыя вытворчыя зьвеньні

Галоўнае зьвяно перабудовы партыйнай і прафсаюзнай работы на прадпрыемствах—гэта перанясеньне цэнтру цяжару партыйнай і прафсаюзнай работы ў нізавое вытворчае зьвяно (цэх, брыгаду, агрэгат, істужку і т. д. Асноўным зьместам работы партыйнай групы на прадпрыемстве зьяўляецца забясьпячэньне ў сваёй брыгадзе, агрэгаце, істужцы выкананьня пляну кольскасных і якасных паказальнікаў. Партыйная група павінна забясьпечыць кіруючую ролю партыі ў сваёй брыгадзе, забясьпечыць ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, своечасова мабілізаваць рабочых на ліквідацыю недахопаў, прарываў, стаць на чале ўдыму і ініцыятывы рабочай масы. Зразумела, што партыйныя групы ў цэлым і кожны ў паасобку камуніст на прадпрыемстве павінен растлумачваць сярод рабочых дырэктывы і пастановы партыі, мабілізоўваць рабочых на барацьбу за генэральную лінію партыі. Партыйная група павінна праводзіць систематычную штодзённую работу на вярбоўцы ў ады нашай партыі лепшых ударнікаў. Партыйная група павінна правяць шырокую ініцыятыву па правядзеньні рацыяналізацыі, мабілізацыі унутраных рэсурсаў, ажыцьцяўленьні жорсткай барацьбы за эканомію аналу, сырцу і матар'ялаў, стаць на чале масавага руху за аўладаньне тэхнікай. Таксама неабходна рашуча напраўляць меўшыя месца асобныя факты бюракратызацыі работы партыйнай групы: вядзеньне пратаколаў, доўгіх пасяджэньняў, і г. д. Гэта зьяўляецца недапушчальным: партыйная група зьяўляецца апэрацыйным нізавым партыйным зьвяном, якое заклікана для таго, каб непасрэдна ажыцьцяўляць, у сваёй брыгадзе дырэктывы і мэрапрыемствы партыі, і ўсякія спробы бюракратызацыі дзейнасьці партгруп павінны сустракаць самы рашучы адпор. Няма неабходнасьці вядзеньня пратаколаў, а можна абмежавацца простым запісам тых канкрэтных мэрапрыемстваў, якія праводзіць група, насяджэньне партыйнай групы праводзіцца па меры неабходнасьці, тут-жа на месцы, работы алкрыты з шырокім прыцягненьнем рабочых данай брыгады, працяжнасьць насяджэньняў партыйнай групы павінна быць абмежавана самым кароткім часам. Толькі ў гэтым выпадку партыйная група будзе тым апэрацыйным партыйным зьвяном у брыгадзе, якое хутка будзе ажыцьцяўляць дырэктывы партыі і рэагаваць на недахопы на вытворчасьці. Ні меншае значэньне мае таксама задача па ўзмацненьні работы трыцутніка ў нізавым вытворчым зьвяне. Калі трыцутнік зараз працуе на прадпрыемстве ў значнай меры ў цэху, то ўніз—у зьвяне, брыгадзе ён працуе дрэнна і наогул яшчэ ня створан. Таму задача арганізацыі трыцутніка ў брыгадзе ў складзе парторга, прафарганізатара і брыгадзіра, а ў зьмене з сакратара зьменнай ячэйкі або зьменнапарторга, зьменнапрафорга і зьменнага майстра і т. д., зьяўляецца неабходнай умовай палепшэньня гаспадарчага кіраўніцтва партыйнай і прафсаюзнай работы.

Пашырыць сетку зьменных ячэек

Неабходна падкрэсьліць, што пастанова ЦК УсеКП(б) ад 21 лістапада 1930 г. аб абсалютоўваньні ўсіх зьмен на прадпрыемствах па лініі партыйнай, прафсаюзнай і гаспадарчай, на радзе нашых прадпрыемстваў ня выконваецца. Вячэрнія і начныя зьмены на большасьці прадпрыемстваў абслугоўваюцца слаба, або зусім не абслугоўваюцца. І наогул ёсьць такія настроі, што найбольшую прадукцыйнасьць могуць даваць толькі дзённыя зьмены, а вячэрнія і начныя павінны абавязкова даваць меншую прадукцыйнасьць». З гэтымі настроямі неабходна рашуча пакончыць. Трэба рашуча стаць на шлях арганізацыйнай перабудовы цэхавых ячэек у напрамку арганізацыі зьменнай ячэйкі. Пры больш правільнай расстаноўцы партыйных сіл, арганізуючы ў поўнай адпаведнасьці з інтарэсамі вытворчасьці, мы маем усе магчымасьці арганізаваць зьменныя ячэйкі амаль на ўсіх прадпрыемствах. Праўда, тут маюцца некаторыя труднасьці, якія заключаюцца ў тым, што на радзе прадпрыемстваў мы маем, так званыя, «кольцавыя» зьмены, г. зн. зьмены з непастаянным складам рабочых. Аднак рад нашых прадпрыемстваў, як напр. «Бярэзіна»—у Барысаве, запалкавая ф-на «Вазуві» ў Новазбеліцы і некаторыя іншыя ўжо дабіліся такой арганізацыі працы, што забясьпечылі пастаянны склад рабочых у зьмене. Гэта тым больш неабходна, што гаспадарчае кіраўніцтва, асабліва партыйная і прафсаюзная работа ў зьменах з пястальным складам рабочых, вельмі дорыць. Мы павінны пастаўіць сваёй задачай дабіцца таго, каб вытворчыя працэсы былі арганізаваны так, каб мець у складзе зьмен сталых рабочых. Вопыт перадавых прадпрыемстваў паказаў, што гэта магчыма. Зразумела, мы ў такім пытаньні ня можам «рубіць з пляча», тут патрабуецца пільнае і дэтальнае вывучэньне ўмоў і вытворчых працэсаў на кожным у паасобку прадпрыемстве. Толькі ў крайнім выпадку, калі абсалютна немагчымы, выходячы з інтарэсаў вытворчасьці, пераход да пабудовы зьмен са сталым складам рабочых, неабходна забясьпечыць у зьмене зьменнапарторга, арабіўшы гэта і па лініі прафсаюзнай. За апошні год мы маем значнае ўзмацненьне цэхавай ячэйкі на прадпрыемствах, але мы ня можам яшчэ сёньня сказаць, што цэх'ячэйка самастойна кіруе ўсёй работай у цэху мы маем яшчэ шмат апекі з боку бюро парт'ячэйкі або партколектыву. Кіраўніцтва з боку заводзкай партыйнай ячэйкі, або калектыву ў разе выпакаў яшчэ ня спрыяе таму, каб цэхавая, або зьменная ячэйка магла разгарнуць сваю ініцыятыву і ў выстарчальнай мэры кіраваць гаспадарчай, прафсаюзнай і масавай работай у сваім цэху. Карэнная перабудова кіраўніцтва з боку бюро фабрычнай заводзкай ячэйкай, перавод цэхаў на гаспадарчы разьлік, рашучае ажыцьцяўленьне прынцыпу адзіначальня, забясьпечвае большую самастойнасьць у рабоце цэхавай і зьменнай ячэйкі, большую адказнасьць іх за становішча работы ў цэху і выкананьне прамфінпляну.

Што паказаў вопыт работы сэктараў

Мы маем ужо зараз некаторы вопыт работы сэктараў пры бюро парткалектываў і цэхавых ячэек. Асноўным недахопам работы сэктараў зьяўляецца погоня за вялікай колькасьцю сэктараў, з якіх некаторыя аказаліся пяжыцьцёвымі. Некаторыя ячэйкі падыйшлі ніправільна да арганізацыі сэктараў наогул, разьбілі ўсю ячэйку па паасобных сэктарах. Гэта зьяўляецца ніправільным. Неабходна абмежаваць колькасьць сэктараў пры бюро ячэйкі, або парткалектыву ня больш 4-5. Гэта наступныя сэктары: сэктар арг. парт. работы; партыйная вучобы; агітмасавы і сэктар кадраў. На чале кожнага сэктару павінен быць арганізатар, які вылучаецца са складу бюро парткалектыву ці ячэйкі і зьяўляецца адказным перад бюро за гэту работу, распрацоўвае асобныя пытаньні, выконвае асобныя заданьні бюро яч. і г. д. Арганізатар сэктару прыцягвае да работы партыйцаў з ліку актыву, прычым неабходна ўлічваць схільнасьць таго ці іншага партыйца і яго здольнасьць у розных галінах партыйнай работы. Пры бюро цэхавай, або зьменнай ячэйкі, арганізуюцца асобныя вучасткі з арганізатарам вучастка на чале, які вылучаецца са складу бюро цэхавай або зьменнай ячэйкі. Колькасьць вучасткаў таксама неабходна абмежаваць 3-4-ма: вучастак арпартработы, партыйнай вучобы, агіт. масавы. Вучастак-жа кадраў можна арганізаваць толькі ў найбольш буйных ячэйках. Вучасткавы арганізатар таксама прыцягвае да работы актыў цэхавай або зьменнай ячэйкі і выконвае па даручэньні бюро ячэйкі рад заданьняў, прапрацоўвае і падрыхтоўвае пытаньні да абгаварэньня бюро цэхавай або зьменнай ячэйкі.

Масавую работу на прадпрыемстве падпарадкаваць задачам выкананьня прамфінпляну

Нельга, зразумела, зьвесьці ўсю перабудову партыйнай і прафсаюзнай работы на прадпрыемствах выключна да арганізацыйнай перабудовы. Ад выразнай пабудовы партыйнай арганізацыі зьверху залежыць вельмі многае. Аднак, адна арганізацыйная перабудова партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі складае яшчэ палову справы і ня вычэрпвае ўсёй перабудовы. Неабходна карэнным чынам палепшыць якасьць работы і перабудаваць унутраны зьмест усёй партыйнай і прафсаюзнай работы на прадпрыемствах. Зьмест партыйнай і масавай работы на прадпрыемствах вызначаецца асноўнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва і навішен быць падначалены ажыцьцяўленьню тэмпаў індустрыялізацыі і пасьпяховаму выкананьню прамфінпляну. Партыйная арганізацыя на прадпрыемствах павінна ня толькі многа займацца пытаньнямі вытворчасьці і прамфінпляну, але і лепей займацца, больш канкрэтна кіраваць і кантэсьць больш набудавана такім чынам, каб яна сяўмыла адной агульнай мэце — пасьпяховаму выкананьню прамфінпляну Асаблівае месца на ўсёй масавай рабоце павінна знайсьці пытальне выкананьня якасных паказальнікаў. Неабходна весьці шырокую практыку правядзеньня сходаў пасобных груп рабочых: старых кваліфікаваных рабочых, маладых рабочых, жэншын ударнікаў, актывістаў і наборнікаў рацыяналізацыі і за аўладаньне тэхнікай, сходы выпаходнаў, праводзіць вечары ўдарнікаў, адпавіць практыку правядзеньня грамадзкіх судоў над прагульшчыкамі, гультаямі і г. д. Мы павінны ліквідаваць маючыя месца на некаторых прадпрыемствах замкнутасьць ударнікаў ад рабочых - пяўдарнікаў. Такія праявы зьяўляюцца неадарэмнымі і ня спрыяюць далейшаму ўцягненьню рабочых на ўдарныя брыгады. Наадварот, неабходна ўзмацніць сувязь і работу ўдарнікаў з рабочымі пяўдарнікамі, уся работа ва ўдарнай брыгадзе павінна быць прыкладам і стымуляваць далейшы рост ударнага руху. Нельга прайсьці міма таго факту, што шэфская работа за апошні час некалькі аслабла. У той час, калі мы зараз стаім перад вялізарнейшымі задачамі на вёсцы, калі падрыхтоўка другой бальшавіцкай весны, выкананьне бальшавіцкіх тэмпаў калектывізацыі патрабуе далейшага ўзмацненьня пралетарскага ўплыву на бядняцка-серадняцкія сялянскія масы,—задача рашучай перабудовы шэфскай работы мае выключнае значэньне. Асноўнай задачай і зьместам шэфскай работы на бліжэйшы час павінна быць далейшая арганізацыя і навялічэньне тэмпаў калгаснага будаўніцтва, рашучае перанясеньне вопыту арганізацыі працы на прадпрыемствах у калгасы, шырокае перанясеньне вопыту сацспаборніцтва, ударніцтва і новых мэтадаў працы на вытворчасьці ў работу калгасаў. Неабходна значна ўзмацніць сувязь паміж прадпрыемствам і калгасам, паміж рабочым калектывам, а ў першую чаргу рабочымі ўдарнікамі і калгаснікамі.

У сучасных умовах, калі склад рабочых на нашых прадпрыемствах у сувязі з шпаркім ростам прамысловасьці значна абнавіўся і амаладзіўся, задача па абслугоўваньні рабочай моладзі набывае асаблівае значэньне. Камсамольскія арганізацыі на вытворчасьці адыгрываюць вялікую ролю, правялі вялікую ініцыятыву ў сацспаборніцтве і ўдарным руху. Але-ж камсамол таксама адстае ў перабудове ўсёй сваёй работы, і абслугоўваньне маладых рабочых кадраў таксама на радзе прадпрыемстваў не адпавядае сучасным запатрабаваньням. Камсамолу таксама неабходна перабудаваць сваю арганізацыйную структуру ў адпаведнасьці са структурай партыйных арганізацый, і перанесьці цэнтр цяжару сваёй работы ў нізавыя вытворчыя зьвеньні. Ёсьць пэўны рад прадпрыемстваў, дзе рабочая моладзь складае пераважную частку рабочага складу і таму задача клясавага выхаваньня маладых рабочых кадраў, толькі пайдўна прыпоўных на вытворчасьць, зьяўляецца важнейшай задачай камсамольскіх і партыйных арганізацый.

Ня меншае значэньне мае таксама работа сярод работніц і жэнак рабочых. За апошні перыяд мы маем значнае ўцягненьне жэнак рабочых у вытворчасьць. Гэта ставіць на ўсёй шырыні перад намі задачу забясьпячэньня бытавых умоў для работы на абслугоўваньні работніц і жэнак рабочых. Неабходна больш рашуча вашырыць сетку дзіцячых устаноў на прадпрыемствах, аддаць асаблівую ўвагу пытаньню падняцьця кваліфікацыі, разгортваньню сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод работніц, значна ўзмацніць масавую і культурную работу сярод работніц і жэнак рабочых. Трэба проста сказаць, што масавая работа сярод работніц адстае ад сучасных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Яшчэ дагэтуль мае месца недаацэнка з боку партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый, работы сярод жанчын на вытворчасьці, неразуменьне таго, што пасьпяховае выкананьне прамфінпляну, асабліва на прадпрыемствах з вялікай колькасьцю работніц, знаходзіцца у простай залежнасьці ад становішча партыйнай, прафсаюзнай і масавай работы сярод работніц.

Вялікае значэньне мае пытаньне аб перадачы вопыту перабудовы партыйнай, прафсаюзнай і гаспадарчай работы лепшых прадпрыемстваў на ўсе іншыя. Трэба адзначыць, што ў нас зусім слаба арганізавана работа на абагуленьні вопыту, на распрацоўцы задач арг. парт. работы. Роля нашага друку ў гэтай галіне нас задаволіць ня можа.

Усе сілы на штурм вышынь трэцяга рашаючага

Вырашэньне задач 3-га году пяцігодкі катэгарычна патрабуе далейшага павышэньня авангардной ролі камуністаў на прадпрыемствах. Зараз мы ня можам задаволіцца запатрабаваньнем ад кожнага камуніста, каб ён быў толькі ўдарнікам, але ён павінен быць ударнікам у вырашэньні ўсіх задач, пастаўленых партыяй. Ён павінен быць ударнікам у галіне правядзеньня рацыяналізацыі, ударнікам у галіне аўладаньня тэхнікай, павінен быць перадавым і лепшым барацьбітом за максімальную эканомію сырцу, аналу, павінен даць узорную якасьць прамысловай прадукцыі — павінен сапраўды быць лепшым ударнікам на вытворчасьці. Ня прыходзіцца ўжо гаварыць аб тым, што першы абавязак камуніста на вытворчасьці — гэта быць ударнікам, актыўна змагацца і самому ажыцьцяўляць ударныя тэмпы работы.

Праверка работы на прадпрыемствах паказвае, што пасьпяховае выкананьне прамфінпляну знаходзіцца ў простай залежнасьці ад становішча перабудовы партыйнай, прафсаюзнай і масавай работы, ад становішча гаспадарчага кіраўніцтва на вытворчасьці. Пасьпяховае выкананьне прамфінпляну 1931 г., які зьяўляецца рашаючым годам пяцігодкі, рашучы пералом катэгарычна патрабуе ад партыйных арганізацый безадкладнай перабудовы ўсёй партыйнай работы зьверху данізу, палепшэньня і больш канкрэтнага кіраўніцтва з боку вязек, гаркомаў, райкомаў і самаго ЦК КП(б)В ніавымі партарганізацыямі, больш канкрэтнай дапамогі ніавому партыйнаму зьвяну, рашучага палепшэньня якасьці і ўзьяўляцьця ўсёй партыйнай і масавай работы на прадпрыемстве на новую вышыню. Уся падрыхтоўчая работа да перавыбараў кіруючых органаў партарганізацыі на прадпрыемствах павінна правядзіцца пад гэтым кутом погляду. Нашы партыйныя арганізацыі на прадпрыемствах павінны прысьці да перавыбараў ужо закончыўшы перабудову ўсёй сваёй работы, ліквідаваўшы адставаньне на радзе вучасткаў і пабіўшыся таго, каб партыйная, прафсаюзная і масавая работа поўнасьцю адпавядала запатрабаваньням сацыялістычнага будаўніцтва і забясьпечыла бальшавіцкія тэмпы работы нашай прамысловасьці і поўнае выкананьне плану.

Аднэй з важнейшых задач партыйных арганізацый на прадпрыемствах зьяўляецца мабілізацыя партыйных і рабочых мас на ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі. Неабходна дабіцца больш актыўнай работы па аўладаньні беларускай мовай камуністамі, а таксама рабочым актывам; праводзіць яшчэ большымі тэмпамі работу па падрыхтоўцы новых пралетарскіх кадраў на кіруючую работу ў прамысловасьці, партыйную і прафсаюзную, неабходна яшчэ больш узмацніць работу на прадпрыемствах па абслугоўваньні на родной мове рабочых розных нацыянальнасьцяй. Партыйныя арганізацыі павінны праводзіць энэргічную работу па мабілізацыі мас вакол ленінскай нацыянальнай палітыкі, на барацьбу з ніадзіарджаўным шавінізмам — галоўнай небяспекай сучаснага зрыву, рашучую барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал-апартуністамі—агентамі клясавага ворага ў радах партыі, шавінізмам дзюрэйскім, польскім і іншым.

Вялізарнейшыя поспехі першых 2-х год пяцігодкі дасягнуты ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, шалёнага супраціўленьня з боку кулака, на падставе рашучай барацьбы за генэральную лінію партыі. Бязьлітасная барацьба з правымі апартуністамі, галоўнай небяспекай па сучасным этапе, а таксама з «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі зьяўляецца неабходнай умовай далейшага прасоўваньня наперад і поўнай перамогі сацыялістычнага будаўніцтва. Па-бальшавіцку перабудаваўшы рады, мабілізуючы ўсе сілы рабочай клясы, пад кіраўніцтвам нашай партыі, выканае поўнасьцю бальшавіцкую праграму 3-га рашаючага году пяцігодкі і завяршыць пабудову фундамэнту сацыялістычнай эканомікі савецкай краіны ў багучым 1931 ".

В. ГАНТМАН.

*) Артыкул зьяўляецца перапрацаваным стэнаграмай дакладу і заключнага слова т. Гантмана на нарадзе сакратароў вытворчых ячэек 17-18 лютага 1931 г.

ХТО ЯНЫ ТАКІЯ

У адказ на паказаньні меншавікоў-шкодлікаў «заграничная делегация» РСДРП(м) апублікавала ў органе нямецкай сацыял-дэмакратыі «Форвэртс» заяву, у якой яна адмаўляе інтэрвэнцыяністкую сутнасьць сваёй тактыкі, усялякае лае тых выдатнейшых дзеячоў меншавізму у СССР, што сядзяць на лаве падсудных, і дэзавуіруе даныя абвінавачэньня, інкрымінуючага падсудным Громану, Суханаву, Шэру і інш. злачынствы, у якіх на судовым следзтве падсудныя прызналі сябе вінаватымі. У гэтым артыкуле мы хочам паказаць сутнасьць палітыкі меншавікоў у адносінах да Савецкага Саюзу так, як яна адбіваецца на старонках афіцыяльнага органу заграничнай делегацыі — «Социалистического (з дазволу сказаць) Вестника». У якасьці сьведкаў па гэтай справе мы выклікаем аўтараў артыкулаў, апублікаваных у «С. В.» — Дана, Гарві, Даліна і інш. Мы спадзяемся, што супроць гэтых сьведкаў у меншавікоў адводу ня будзе. Яны—афіцыяльныя лідэры меншавікоў і выказьнікі іх «крэдо», таксама, як і «Соц. Спэстник» — афіцыяльны орган гэтай партыі.

Перш за ўсё некалькі слоў аб падсудных. Яшчэ нядаўна заграничная делегация меншавікоў так характарызавала іх і іх прыцялёў — Рамзіных, Кандрацьцевых:

«Выдатныя прафэсары і гасладарнікі, як Кандрацьцеў, Юроўскі, Рамзін, піянэры расійскай каапэрацыі, як Садырын, Чаянаў, старыя сацыялістычныя вучоныя і публіцысты, як Громан, Суханаў і дзесяцігодзьдзямі стаўшыя ў радах сацыялістычнага руху... — гэтыя людзі ўступілі нібы ў змову»,—пішуць меншавікі з заграничнай делегацыі. «Пачто, однако, не вечно под луной». Учарашнія прыцелі, «самыя вядомыя прадстаўнікі рускай інтэлігенцыі», сёньня ўпалі ў няміласьць заграничнай делегацыі. Яны-ж прызнаюцца ў тым, у чым ня хоча прызнацца заграничная делегация, прызнаюцца за сябе і за ня.

На гэтай падставе яны абвяшчаюцца ледзь не агентамі ДПУ. Трансфармацыя сапраўды дзіўная. ДПУ мярэпчыцца ім усюды, нават у сваёй уласнай верхавіны — накшталт «Канцтфэрштана», з вядомага апавяданьня. Ня будзем гаварыць аб тым, наколькі заслугоўвае ўвагі заява заграничнай делегацыі меншавікоў аб тым, што «яны — не яны і конь ня іх». Грош цана такой заяве. Пройдзем да ўстановак меншавіцкіх лідэраў, з якіх ясна відны іх сапраўдныя адносіны да пытаньняў інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу, адносіны да імпэрыялістычных гаспадароў, словам — усё тое, ад чаго яны сьпішаюцца адхрысьціцца. Асноўнымі лёзунгамі антысавецкай кампаніі за апошні час зьяўляюцца лёзунгі аб «дэмпінгу» *) і аб прымусовай працы». Інтэрвэнцыяністкая сутнасьць гэтых лёзунгаў даволі выкрыта самімі прадстаўнікамі імпэрыялістычнага лягеру. Ад адносін да гэтых лёзунгаў залежыць пазыцыя ў пытаньні аб інтэрвэнцыі. Паглядзім, як-жа меншалікі ставяць тут пытаньне. Яны цьвердзяць, з усімі агаворачкамі, што Савецкі Саюз займаецца дэмпінгам. «Бросавы экспарт рускага збожжа — заяўляюць яны вусна-мі Брагінскай — зьніжэў цэны на жыта на сусьветным рынку». Але праз 4 нумары ў артыкуле А. Югава даецца такая зноска: «Пакуль Расія ўсяго вывезла збожжа, паводле даных замежнага друку, менш 5 проц. не даваеннага вывазу і калі 10 проц. не вывазу ў 1926-27 г.» І заяўляюць, што «савецкі дэмпінг... — моцна раздутае, але адносна невялікае зьявішча» **). Што ім да лёгікі. Фігаро тут, Фігаро там. Дэмпінгу няма—дэмпінг ёсьць. Але справа ня ў гэтым. Справа ў закліку арганізаваць «эканамічную блёкаду Савецкай Расіі». Тут ужо проста выступае аскал зубоў Рабушынскіх-Нобэляў. Іх справу вядуць іх адвакаты-меншавікі.

«Прымусовая праца» ў СССР — якая улюбёная тэма для буржуазнага друку. Не мінавала чаша гэта і меншавікоў. Яны таксама ня хочуць застацца ў хвасьце. Паводле вылічэньняў меншавіцкіх пігіфя, у СССР ня можа ня быць беспрацоўных. Беспрацоўе павінна ўзрастаць. А калі яно не ўзрастае, то ня іх віна. Яны тнуць сваё. Акрамя беспрацоўя ў СССР аказваецца існуе «недахват рабочай сілы», які «перашкаджае ў ніпучасьце для савецкай прамысловасьці. Таму органы ўлады ўжываюць новыя меры — да замацаваньня рабочых і простай забароны пакідаць месцы работы» *). Як гэта ўзязаць — пяхай Карл Каўцкі разьбярэ. Сапраўды —«каго Юпітэр хоча пакараць, таго ён пазбаўляе розуму». Важны ня розум, важна тое, што «трэба змагацца з асноўнымі элементамі гаспадарчай палітыкі, з усёй устаноўкай новага курсу, з індустрыялізацыяй краіны». Барацьба з індустрыялізацыяй краіны — як рэцэпт ад... беспрацоўя. Добрыя, аднак, гусі!

Зусім зразумела, што гэтыя артыкулы маюць мэтай адно: падрыхтоўку грамадзкай думкі буржуазіі ўсяго сьвету да інтэрвэнцыі, не маральнае апраўданьне. Перш за ўсё меншавікі пачынаюць крычаць — «Яма інтэрвэнцыі», «нікай інтэрвэнцыі ня рыхтуецца». Яны кліпуць ца пакат, што яны супроць усякай інтэрвэнцыі (гэта якая ня рыхтуецца), што «сацыялістычныя рабочыя сьвету» (гэта тыя правадыры сацыял-дэмакратыі, як

АПОШНІ ДЗЕНЬ ДЭКАДЫ ПРАВЕРКІ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЯЎБЫ

ПАСЕЎНЫЯ ШТАБЫ НЕ ПАВЯРНУЛІСЯ ТВАРАМ ДА БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ

ВЫНІКІ САМАЦЁКУ, ПЛЯНАВАЙ БЛЫТАНІНЫ І КАНЦЫЛЯРСКАЙ ТВОРЧАСЬЦІ АПАРАТАЎ НКЗ І КАЛГАСНА-КААПЭРАЦЫЙНЫХ ЦЭНТРАЎ ТАКІЯ:

БССР яшчэ ня мае пляну забесьпячэньня пасеўнай плошчы насеньнем. Абмен простага насеньня на гатункове не распачаты

На 1 сакавіка па БССР закантрактавана... 181 гэкт. ільну і 6 гэкт канапель. Загатоўкі насеньня тэхнічных і кармавых культур не разгорнуты

Сьвінавод скарачае свой пасеўны плян на 24.000 гэкт. Толькі нязначная колькасьць саўгасаў дапамагае калгасам

Цэнтральныя с.-г. арганізацыі павінны працаваць па-ўдарнаму. Самая рашучая барацьба з апартуністычнай практыкай і бюракратызмам работнікаў, якія перашкаджаюць пасеўным штабам першымі падрыхтавацца да бою.

Адсутнасьць апэрацыйнасьці, бюракратызм, самацёк

Вынікі праверкі цэнтральных с.-г. арганізацый

Сёгуленьові пленум ЦК КП(б)Б закастрыў увагу ўсёй партарганізацыі і адпаведных с.-г. арганізацый на неабходнасьць рашуча разгарнуць падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны, хуткімі тэмпамі ліквідаваць прарывы на радзе вучасткаў падрыхтоўкі.

Першая шырокая праверка ЦКК НК-РСІ ходу падрыхтоўкі да вясны (сёгудзень - люты месяцы) сыгналізавала, што існуючых тэмпы падрыхтоўкі ні ў якім разе не забясьпечваюць выканаьня вызначаных пляцаў.

Праверка, якая зараз праведзена ЦКК НК-РСІ сумесна з друкам, сьведчыць аб тым, што зруху ўсё яшчэ не дасягнута, што пляны некаторых мерапрыемстваў —пад пагрозай зрыву.

Прыводзім рад фактаў. На дырэктыву ЦК КП(б)Б аб арганізацыі дэкады праверкі Упраўзіцці раёў тэлеграфна паведамляе Наркамзему—«вестак аб ходзе праверкі сельсаветы не даюць», Лельмыцкі раён—«вестак сельсаветы не даюць» і г. д.

На выклік Наркамзему адзінаццаці раёнаў зрабіць справаздачы аб ходзе падрыхтоўкі да весьнавой кампаніі, адгукнуліся ўсяго 4 раёны, пры чым аказалася, што 2 з іх нічога ня ведаюць аб тым, што робіцца ў раёне.

Паступленьне вестак па асноўных мерапрыемствах за апошні час не палепшылася, а, наадварот, пагоршылася. У першую дэкаду лютага весткі прысылалі 70 раёнаў, а ў апошнюю дэкаду—усяго толькі 40.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што ў значнай колькасьці раёнаў кіруючыя раённыя органы як партыйныя, так і савецкія, апартуністычна адносяцца да выканьня падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай сяўбы, што рашучага пералому не дасягнута і па сёньняшні дзень.

Далёка ня ўсё добра стаіць і ў цэнтральных зямельна - калгасна - каапэрацыйных органах. БЮРАКРАТЫЗМ І САМАЦЁК па некаторых установах — вось галоўныя тормазы ажыцьцяўленьня асноўных дырэктыў партыі і ўраду.

Напрыклад, Дзяржбанк не «соблаговолил» да сёньняшняга дня прапрацаваць адозву партыі і ўраду аб кантрактацыі, ня склаў плянаў фінансаваньня мерапрыемстваў да весьнавой пасеўнай кампаніі, а арыентовачныя пляны крэдытаваньня 1-га кварталу накіраваў у раёны толькі 9 лютага. Вестак-жа, як пляны даведзены да калгасаў, саўгасаў і вытворчых каапэрацыйных аб'яднаньняў, у Дзяржбанку няма. Крэдыты на кантрактацыі адпускаюцца злачынна марудна. Даволі адзначыць, што крэдыты на кантрактацыю тэхкультур яшчэ фактычна не адпушчаны, ня гледзячы на тое, што з Дзяржбанку СССР сродкі пераведзены.

Балёны штаб другой бальшавіцкай весны—Наркамзем—працуе кляўзрана, а ў ажыцьцяўленьні некаторых мерапрыемстваў ім дапушчаны прарывы. Прапарцыўка адозвы аб кантрактацыі адбылася толькі 27 лютага. У гэты-ж дзень былі высланы ў раёны пляны кантрактацыі. ТРЭБА БІЦЬ ТРЫВОГУ У СУВЯЗІ З НЕЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕМ НАСЕНЬНЕМ ПАСЕЎНЫХ ПЛОШЧАЎ. Трэба проста прыпягнуць да судовай адказнасьці некаторых работнікаў апарату за нядбайныя адносіны да гэтай важнейшай справы. Складаньне пляну забесьпячэньня насеньнем і зараз на скончана. Насенныя балянсы з раёнаў не атрыманы. Такім чынам, пытаньне аб патрэбнасьці насеньня, крыніцы і шляхі яго забесьпячэньня яшчэ вырашаны і невядомы. Адсоль пагроза структуры пасеўных плошчаў, якая была вызначана ў кантрольных лічбах ураду, і плянам сяўбы.

За гэта ў першую чаргу павінна несьці адказнасьць калегія Наркамзему, якая ў сваёй пастанове ад 31 сьнежня 1930 г. складаньне плянаў забесьпячэньня насеньня ўскладала выключна на спэцыяльныя цэнтры сельска-гаспадарчай каапэрацыі і саўгасаб'яднаньні. Пра некаторыя-ж час калегія паведаміла ўсім каапэрацыйным цэнтрам, што маг'ралы для складаньня плянаў будуць прадстаўлены Наркамземам. Аднак, абіцаныя матар'ялы ня былі прадстаўлены і, зразумела, пляны каапэрацыйнымі цэнтрамі ня складзены. У канчатковым выніку—агідная блытаніна цягнецца і зараз—«усё прадастаўлена само себе»—самы яркі апартуністычны самацёк.

Адсутнічае таксама належны кантроль за загатоўкай насеньня і завозам яго з іншых раёнаў. Між тым, загатоўкі адуць значныя дрэнна. Напрыклад, на 20 лютага плян па капюшыне выкананы на 6,1 проц., па сэрадэлі — на 3 проц., па лубіне — на 2 проц. і г. д.

Здача насеньня і абмен яго саўгасамі зусім не праводзіцца. Мала таго, рад саўгасаў самі патрабуюць насеньня. Так, саўгасы Белсельтрэсту патрабуюць капюшыны—247 цэнтнэраў, цімафеўкі—170 цэнтн., сэрадэлі — 2.508 цэнтн. і г. д. Што-ж гаварыць аб тых саўгасах, якія пядаўна арганізаваны, або аб тых, якія будуць арганізаваны на працягу падрыхтоўкі да весьнавой пасеўнай кампаніі?

Трэба безадкладна ў 5-дзенны тэрмін скласьці плян забесьпячэньня насеньнем, выявіўшы наяўнасьць упасных насенных рэсурсаў, і дабіцца завозу з іншых раёнаў СССР. Трэба адначасова зрабіць поўную праверку ўсіх савецкіх гаспадарак, каб выявіць іх запрэўдны стан з насеннымі фондамі і колькасьць насеньня, якое можа быць перадане калгасам і бядняцкім гаспадаркам.

Увесь абмолот у саўгасах і калгасах (усіх культур) павінен быць праведзен на працягу адной дэкады.

У выключна нездавальняючым становішчы—завоз у БССР штучнага ўгнаеньня і прасоўваньне яго, а таксама с.-г. машын у саўгасы, калгасы і вытворча-каапэрацыйныя аб'яднаньні. Раённыя арганізацыі зусім бяздзейнічаюць, а Белхэмтрэс проста зрывае завоз угнаеньня. З вызначаных 19.603 тон ня сёньняшні дзень завезена толькі 8.603 тоны. Між тым, сапная дарога засталася ня больш, як на месяц. Некаторыя саўгасныя цэнтры нават адмаўляюцца ад штучнага ўгнаеньня (Белкаапсаюз адмовіўся ад 1.500 тон, Сьвінавод—ад 2.500).

Надзвычайна дрэнна справа з выкананьнем пастановы СНК аб арганізацыі рамонтных майстэрань як сярэдняга, так і дробнага рамонту. Нічога ня зроблена ў гэтым напрамку Саюзхлебам, Насентрэстам, Ільнатрэстам.

Асабліва адстаюць у разгортваньні рамонту інвэнтару калгасы. Палуе безадказнасьць ня толькі з боку старшынь калгасаў і райкалгассаюзаў, але і Белсельгасснабу, які не забясьпечвае набудову майстэрань абсталяваньнем. Тэмп рамонту трактараў усё яшчэ нездавальняючы. Замест 70 проц. на 1 сакавіка адрамантавана ўсяго 60 проц.

Выйдзе рад прарываў і па лініі саўгасаў. Грамадзкасьць невыстарчальна ўзаварушана. Мэтады сацыябаркіцтва і ўдарніцтва ўкараніцца слаба. Саўгасы Сьвінавода ўжо пачынаюць скарачаць пасеўныя плошчы: з 60.000 да 36.000 гэкт. Рад саўгасаў да рамонту інвэнтару зусім не прыступілі (Рыме, Халопенічы, Носавічы і інш.). Праекты будаўніцтва яшчэ ня складзены.

Па саўгасах Ільнатрэсту не хапае 61 трактара. Паступленьня іншых с.-г. машын зусім няма. Пасеўныя плошчы яшчэ канчаткова ня вызначаны. Саюзільнатрэст вызначыў 3.300 гэкт., а Наркамзем БССР—6.000 гэкт. Ідзе яшчэ торг. Саўгасы не зямляўпарадкаваны. З вызначаных да завозу 3.785 тон угнаеньня паступіла ўсяго 188 тон. Насеньне зусім не завозіцца, асабліва ў новых арганізаваных саўгасы.

Адным з галоўнейшых недахопаў работы саўгасаў зьяўляецца поўная адсутнасьць з боку большасьці саўгасаў дапамогі нова-арганізаваным калгасам і бядняцкім індывідуальным гаспадаркам як у рамонце інвэнтару, ачыстцы збожжа, так і ў самой арганізацыі калектыўнай гаспадаркі.

У справе ажыраўленьня спэцыялістаў у раёны з боку некаторых устаноў праяўлена агідная бязьдзейнасьць і безадказнасьць. Побач з поўным выкананьнем мабілізацыйных плянаў большасьцю арганізацый, рад устаноў зусім адмаўляюцца мабілізаваць сваіх спэцыялістаў (хэмічная лябараторыя, Балотны інстытут, ЦП саюзу сельгасрабочых, Белсельснаб і інш.). Сам Наркамзем выканаў пляны толькі на 50 проц.

На аснове матар'ялаў праверкі РСІ будуць прыняты рашучыя меры. Але побач з гэтым грамадзкасьць павінна павесьці рашучую барацьбу з апартуністычнай бязьдзейнасьцю паасобных устаноў, арганізацый і супрацоўнікаў, дапамагаючы разгортваньню патрэбных тэмпаў у падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны, змагаючыся за забесьпячэньне поўнага выкананьня плянаў і дырэктыў партыі.

На барацьбу за ўдарныя тэмпы ў падрыхтоўцы да сяўбы!

Р. КАРШАКЕВІЧ.

Чарапашыя тэмпы

Адозва СНК БССР і Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б ад 2-га лютага зьяўляецца па сутнасьці генэральным плянам работы кожнай арганізацыі і ў першую чаргу сыстэмы і паасобных работнікаў ільнакапляводчай каапэрацыі на бліжэйшы прыяд часу.

З часу апублікаваньня адозвы мінуў ужо месяц. Зараз, правяраючы выкананьне адозвы, неабходна з усёй рашучасьцю канстатаваць, што рэалізацыя яе ў ільнаводчых раёнах праходзіць недапушчальна дрэнна.

Некаторыя раённыя арганізацыі надзвычай мала цікавяцца практычным ажыцьцяўленьнем дырэктыў аб кантрактацыі, большасьць-жа райкаапсаюзаў ільнаводчых раёнаў нават не прыступіла да выкананьня сваіх канкрэтна вызначаных плянаў, вынікаючых з адозвы СНК і ЦК і прынятых на сходзе старшынь райкаапсаюзаў ільнаводчай каапэрацыі ад 8-га лютага г. г.

У адозьве ясна сказана, што УСЯ РАБОТА ПА КАНТРАКТАЦЫІ, уключаючы і афармленьне дагавароў, ПАВІННА БЫЦЬ ЗАКОНЧАНА ДА 1-га КРАСАВІКА г. г. У інструкцыі, разасланай раёнам, прапануецца першыя зводкі аб ходзе кантрактацыі прадставіць не пазьней 25-га лютага, на справе-ж да гэтага тэрміну толькі два раёны далі лічбовую справаздачу аб ходзе кантрактацыі тэхнічных культур. Гэта—Гарадоцкі раён, які закантрактаваў у калгасах 175 гэкт. ільну і 3 гэкт. канапель, і Чырвонапольскі раён—1 гэкт. ільну. Па 1-га сакавіка г. г. даў весткі толькі адзін Гомельскі раён, які закантрактаваў усяго 5 гэкт. канапель.

Такім чынам, ДА 1-га САКАВІКА ЗАКАНТРАКТАВАНА ЎСЯГО 181 ГЭКТ. ІЛЬНУ І 6 ГЭКТ. КАНАПЕЛЬ. Ясна, што чарапашныя тэмпы кантрактацыі тэхнічных культур не забясьпечваюць выкананьня пляну. Ужо ў самым пачаткуэтай работы трэба біць трывогу і сыгналізаваць аб пагрозе прарыву кантрактацыі тэхнічных культур.

Нельга замаўчаць недахопы цэнтральных арганізацый у гэтай рабоце і ў прыватнасьці Беньільнасаюзу, які вінаваты ў тым, што дагаворы, інструкцыі, сьпісы кантрактаўшчыкоў і пратаколы былі надрукаваны і разасланы толькі ў пэрыяд ад 23 да 26 лютага. Менская паштова-тэлеграфная кантора адпраўку гэтых друкаваных матар'ялаў затрымала на два дні.

Паступаючыя матар'ялы і самыя тэмпы работы сьведчаць, што на мясцох грамадзкасьць вакол пытаньняў кантрактацыі мабілізавана слаба. Рад калгасаў, да рэчы, да гэтага часу ня маюць вытворчых плянаў і такім чынам ня ведаюць, якімі культурамі і ў якой колькасьці будуць засявацца іх палі.

Рэалізацыя сродкаў вытворчасьці, як: машын, угнаеньняў і насеннага матар'ялу праходзіць надзвычай дрэнна і, галоўнае, шмат у якіх выпадках ня ўвязваецца з кантрактацыяй.

Рад маламоцных і новых калгасаў сустракаюць часта затрудненьні пры пакупцы сродкаў вытворчасьці—ня маюць наяўных грошай для ўнясеньня гатоўкаю тэй часткі, якая прылічваецца з іх, згодна шкалы крэдытаваньня. Дапамагчы ў гэтым выпадку павінны былі кантрактыйныя авансы, але крэдыты Дзяржбанкам пераведзены раёнам толькі 2 сакавіка.

Такая кляўзка ў рабоце цэнтральных арганізацый, адсутнасьць масавай работы вакол выкананьня адозвы СНК і ЦК, адсутнасьць сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў у рабоце па кантрактацыі тэхнічных культур, ствараюць пагрозу зрыву важнейшых мерапрыемстваў партыі і ўраду.

Засевы ільну і, у першую чаргу, плошча ільну, якая кантрактуецца, поўнасьцю забясьпечаны пасеўным матар'ялам, а таксама і іншымі сродкамі вытворчасьці, якія ў першую чаргу павінны адпускацца кантрактуючым гаспадаркам, і пад культуры, якія кантрактуюцца.

Для рэалізацыі пастановы аб кантрактацыі трэба неадкладна дабіцца рашучага пералому. Трэба пакончыць з «тэорыяй самацёку» і апартуністычнымі разважаньнямі, што «да выхаду ў поле засталося каля 1½ месяца, а таму няма куды сьпяшацца».

Трэба памятаць, што кантрактацыя мае мэтай перш за ўсё плянавае ўкараненьне пасеваў патрэбных нам культур для сацыялістычнай прамысловасьці і для забесьпячэньня патрэб узрастаючай рабочай клясы.

Таму кантрактацыя павінна поўнасьцю быць закончана да выхаду пасеўшчыкаў у поле. Зусім правільна ў нашых ўмовах устаноўлен тэрмін скончэньня кантрактацыі—1-га красавіка. Праваапартуністычныя разважаньні «сьпяшацца няма куды», «часу даволі»—павінны быць рашуча зжыты.

У рабоце па кантрактацыі тэхнічных культур павінны быць узяты сапраўды бальшавіцкія тэмпы. Пляны кантрактацыі да 1-га красавіка г. г. павінны быць выкананы на ўсе 100 проц.

ЛАЦІС.

Да выпуску ўсебеларускай саўпартшколы

Сёньня ўсебеларуская саўпартшкола, лябараторыя па падрыхтоўцы кіруючых пізаных партыйных кадраў, выпускае з двух сваіх асноўных аддзяленьняў (прапагандысцкага і калгаснага) 95 слухачоў, зкліканых атрыманыя імі ў школе марксыцка-ленінскія веды, тэарытычную ўзброенасьць і посьпехам скарыстаць у практычнай рабоце на тых вучастках работы, куды яны будуць пастаўлены партыяй.

Таварышы, скончыўшыя саўпартшколу, прыступаюць да практычнай работы ў гістарычны пэрыяд, у першым квартале трэцяга рашаючага году пяцігодкі, які паставіў перад нашай краінай рад вялізарных адказьнейшых задач. Ад кожнага выпускніка камуністычнай партыя ў праве патрабаваць і патрабуе ўменьня рашуча змагацца за яе генэральную лінію, барацьбы на два фронты, з правым апартунізмам у першую чаргу, уменьня ў практычнай рабоце пабальшавіцку ажыцьцяўляць ленінскую нацыянальную палітыку, па-бальшавіцку змагацца з усімі скажэньнямі нацыянальнай палітыкі, уменьня сапраўды па-бальшавіцку змагацца з вялікадзяржаўным шавінізмам, галоўнай небясьпекай на даны пэрыяд, з контр-рэвалюцыйным беларускім нац.-дэмакратызмам і з шавінізмамі іншых колераў.

Кожны выпускнік павінен быць добрым арганізатарам мас на справу пасьпяховага выкананьня генэральнага лёзунгу партыі: «Пяцігодка—за чатыры гады», задач далейшага нерамоўнага разгортваньня сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце.

Іменна зараз, як ніколі, кожнаму выпускніку належыць уявіць, што задачы 3-га рашаючага году пяцігодкі патрабуюць ад яго быць ударнікам ва ўсёй яго рабоце. Нельга сабе ўявіць, каб выпускнік, які прыступае да практычнай работы, не працаваў-бы рэвалюцыйнымі формамі і мэтадамі, ня быў-бы пачынальнікам, актыўным змагаром у справе ліквідацыі недахопаў, якія ёсьць на фоне нашых вялізарных дасягненьняў.

Выпускнікі ідуць у асноўным на два адказьнейшыя вучасткі работы — на вучастак партыйна - прапагандысцкай работы, на вучастак калгаснай работы. Рэвалюцыйная тэорыя марксызму-ленінізму ва ўмовах сацыялістычнага наступленьня, якое шырока разгортваецца, і абвостранай клясавай барацьбы надзвычайна асабліва актуальнае значэньне. Яшчэ большае аўладаньне, узброеньне марксыцка - ленінскай тэорыяй найшырэйшых беспартыйных рабочых, бяднацка-калгасных мас, самая шчыльная ўвязка вывучэньня тэорыі з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва, барацьбы за лепшую і хутчэйшую ліквідацыю значных прарываў у партасьвеце гэтага году — работа, якая павінна быць у цэнтры ўвагі таварышоў, што ідуць на прапагандысцкую работу.

Наша прамысловасьць і сельская гаспадарка будуюцца на высокай тэхнічнай базе. Для заварушэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі нашай краіны, для яшчэ больш пасьпяховага ўбудаўніцтва сацыялізму, нам патрэбны дзесяткі, сотні, тысячы ня толькі палітычна сьвядомых, культурных, пісьменных будаўнікоў, тэхнічна пісьменных рабочых, калгаснікаў. У барацьбу за тэхніку, за поўнае аўладаньне ёю павінны ўступіць выпускнікі.

Клясавы вораг добраахвотна не здае сваіх пазыцый. Клясавы вораг супрацьдзеяньня сацыялістычнаму наступленьню. Клясавы вораг імкнецца захаваць свой уплыў на масы, затрымацца асабліва на тых вучастках, дзе нам яшчэ трэба шмат папрацаваць на ідэалёгічным фронце. Розная віду буржуазнымі тэорыямі, рубішчынай, дэдарынчынай, рэшткамі контр-рэвалюцыйных меншавіцкіх тэорый, тэорыяй контр - рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў і г. д. імкнецца клясавы вораг затрымаць разгортваньне сацыялістычнага наступленьня на ідэалёгічным фронце. Выпускнік павінен быць актыўным змагаром за марксыцка-ленінскую рэвалюцыйную тэорыю, пачынальнікам у справе выкарчоўваньня буржуазных тэорый на ідэалёгічным фронце.

Шпаркім тэмпам ідзе рост сельскай гаспадаркі БССР, асабліва ня сацыялістычнага сэктару. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі пралетарыят БССР у цеснай сувязі з асноўнымі масамі вёскі, апіраючыся на калгасьніка, бедняка, разгортвае пераможнае сацыялістычнае наступленьне на капіталістычныя элементы вёскі, на базе суцэльнай калектывізацыі ліквідзе кулацтва, як клясу. Кулак набіт і моцна набіт, але яшчэ канчаткова не дабіт. Дабіць кулака, яшчэ лепш арганізаваць масы на барацьбу з вылазкамі клясавага ворага, дабіцца шырока разгорнутай масавай і арганізацыйнай работы, поўнай рэалізацыі пастановаў ЦК КП(б)Б аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі, пастановаў аб другой бальшавіцкай вясне—вось тое, над чым трэба будзе працаваць таварышом, якія ідуць у важнейшае зьвяно работы партыі на вёсцы—у калгасную сыстэму.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб становішчы ўсебеларускай саўпартшколы адзначыў рад буйнейшых палітычных прарываў у рабоце апошняй. На ліквідацыю гэтых прарываў парткалектыў, кіраўніцтва школы мабілізуюць усю масу слухачоў школы. Кожнаму выпускніку трэба сябе праверыць, наколькі ён мабілізаваны на самую упартую барацьбу з усімі скрыўленьнямі клясавай лініі, наколькі ён здолеў дапамагчы школе выправіць памылкі, якія там мелі месца, каб не дапускаць паўтарэньня такіх памылак, як і іншых памылак, у тым месцы, дзе ён будзе працаваць.

Тыя веды, якія атрымаў выпускнік у школе, ня могуць для яго зьяўляцца канчатковымі. У сваёй практычнай рабоце ён павінен іх замацоўваць, усямерна разьвіваць. Вучыцца і яшчэ раз вучыцца, вучыцца рэвалюцыйнай тэорыі, праламляць яе на практыцы, перамагаць труднасьці, якія ёсьць на шляху сацыялістычнага будаўніцтва і зьяўляюцца труднасьцямі нашага росту, вучыцца быць прыкладным барацьбітам зь генэральную лінію партыі, за перамогу сацыялізму ў нашай краіне.

С. РЫЧКОЎ.

Машыны і інвэнтар ляжаць на складах

Арганізаваны брыгадамі ЦКК-НК РСІ і «Зьвязды» «налёт» па цэнтральныя ўстановы паказаў, што большасьць з іх яшчэ дагэтуль не пераключылася на баявую падрыхтоўку да весьнавой пасеўнай кампаніі.

Некаторыя раённыя арганізацыі надзвычай мала цікавяцца практычным ажыцьцяўленьнем дырэктыў аб кантрактацыі, большасьць-жа райкаапсаюзаў ільнаводчых раёнаў нават не прыступіла да выкананьня сваіх канкрэтна вызначаных плянаў, вынікаючых з адозвы СНК і ЦК і прынятых на сходзе старшынь райкаапсаюзаў ільнаводчай каапэрацыі ад 8-га лютага г. г.

У адозьве ясна сказана, што УСЯ РАБОТА ПА КАНТРАКТАЦЫІ, уключаючы і афармленьне дагавароў, ПАВІННА БЫЦЬ ЗАКОНЧАНА ДА 1-га КРАСАВІКА г. г. У інструкцыі, разасланай раёнам, прапануецца першыя зводкі аб ходзе кантрактацыі прадставіць не пазьней 25-га лютага, на справе-ж да гэтага тэрміну толькі два раёны далі лічбовую справаздачу аб ходзе кантрактацыі тэхнічных культур. Гэта—Гарадоцкі раён, які закантрактаваў у калгасах 175 гэкт. ільну і 3 гэкт. канапель, і Чырвонапольскі раён—1 гэкт. ільну. Па 1-га сакавіка г. г. даў весткі толькі адзін Гомельскі раён, які закантрактаваў усяго 5 гэкт. канапель.

Такім чынам, ДА 1-га САКАВІКА ЗАКАНТРАКТАВАНА ЎСЯГО 181 ГЭКТ. ІЛЬНУ І 6 ГЭКТ. КАНАПЕЛЬ. Ясна, што чарапашныя тэмпы кантрактацыі тэхнічных культур не забясьпечваюць выкананьня пляну. Ужо ў самым пачаткуэтай работы трэба біць трывогу і сыгналізаваць аб пагрозе прарыву кантрактацыі тэхнічных культур.

Нельга замаўчаць недахопы цэнтральных арганізацый у гэтай рабоце і ў прыватнасьці Беньільнасаюзу, які вінаваты ў тым, што дагаворы, інструкцыі, сьпісы кантрактаўшчыкоў і пратаколы былі надрукаваны і разасланы толькі ў пэрыяд ад 23 да 26 лютага. Менская паштова-тэлеграфная кантора адпраўку гэтых друкаваных матар'ялаў затрымала на два дні.

Паступаючыя матар'ялы і самыя тэмпы работы сьведчаць, што на мясцох грамадзкасьць вакол пытаньняў кантрактацыі мабілізавана слаба. Рад калгасаў, да рэчы, да гэтага часу ня маюць вытворчых плянаў і такім чынам ня ведаюць, якімі культурамі і ў якой колькасьці будуць засявацца іх палі.

Рэалізацыя сродкаў вытворчасьці, як: машын, угнаеньняў і насеннага матар'ялу праходзіць надзвычай дрэнна і, галоўнае, шмат у якіх выпадках ня ўвязваецца з кантрактацыяй.

Рад маламоцных і новых калгасаў сустракаюць часта затрудненьні пры пакупцы сродкаў вытворчасьці—ня маюць наяўных грошай для ўнясеньня гатоўкаю тэй часткі, якая прылічваецца з іх, згодна шкалы крэдытаваньня. Дапамагчы ў гэтым выпадку павінны былі кантрактыйныя авансы, але крэдыты Дзяржбанкам пераведзены раёнам толькі 2 сакавіка.

Такая кляўзка ў рабоце цэнтральных арганізацый, адсутнасьць масавай работы вакол выкананьня адозвы СНК і ЦК, адсутнасьць сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў у рабоце па кантрактацыі тэхнічных культур, ствараюць пагрозу зрыву важнейшых мерапрыемстваў партыі і ўраду.

Засевы ільну і, у першую чаргу, плошча ільну, якая кантрактуецца, поўнасьцю забясьпечаны пасеўным матар'ялам, а таксама і іншымі сродкамі вытворчасьці, якія ў першую чаргу павінны адпускацца кантрактуючым гаспадаркам, і пад культуры, якія кантрактуюцца.

Для рэалізацыі пастановы аб кантрактацыі трэба неадкладна дабіцца рашучага пералому. Трэба пакончыць з «тэорыяй самацёку» і апартуністычнымі разважаньнямі, што «да выхаду ў поле засталося каля 1½ месяца, а таму няма куды сьпяшацца».

Трэба памятаць, што кантрактацыя мае мэтай перш за ўсё плянавае ўкараненьне пасеваў патрэбных нам культур для сацыялістычнай прамысловасьці і для забесьпячэньня патрэб узрастаючай рабочай клясы.

Таму кантрактацыя павінна поўнасьцю быць закончана да выхаду пасеўшчыкаў у поле. Зусім правільна ў нашых ўмовах устаноўлен тэрмін скончэньня кантрактацыі—1-га красавіка. Праваапартуністычныя разважаньні «сьпяшацца няма куды», «часу даволі»—павінны быць рашуча зжыты.

У рабоце па кантрактацыі тэхнічных культур павінны быць узяты сапраўды бальшавіцкія тэмпы. Пляны кантрактацыі да 1-га красавіка г. г. павінны быць выкананы на ўсе 100 проц.

ЛАЦІС.

Кантрактацыя не афармляецца

Угнаеньні загрузьлі на складах

СЛУЦАК. (Наш кар.).

Паводле пляну райкаапсаюзу, да пасеўнай кампаніі у раён трэба завезьці 719 тон розных угнаеньняў. Завезена-ж 240 тон, а прасунута на месцы, у калгасы 92,5 тон, што складае 12 проц. пляну. Калі ў бліжэйшыя-ж дні ня будзе дасягнута пералому, дык угнаеньне можа застацца нескарыстаным.

Акрамя таго, Белсельснаб зьбіраецца завозіць калійныя ўгнаеньні ў непераапрацаваным відзе. Так, сільвініт мяркуецца адгрузіць пасьля 15 сакавіка неразмолатым з тым, каб яго размалоць на вапняных млынох раёну. Гэта фактычна азначае — ня даць калійных угнаеньняў да вясны. Райкаапсаюз і Белсельснаб ніяк ня могуць дагаварыцца калі і ў якім відзе адгружаць ўгнаеньне.

З боку калгасаў назіраецца недаацэнка значэньня мінэральных угнаеньняў у справе барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці. Толькі 13 калгасаў з 63 выпісалі ўгнаеньне, але і яны вывезьлі ня больш паловы вызначанай ім колькасьці, а калгас «Батрак» ня вывез ні аднаго кілёграма. Некаторыя калгасы як «Ленінскі шлях», зусім адмаўляецца браць штучныя ўгнаеньні. Гэта вынік таго, што райкалгассаюз фармальна давёў пасеўныя пляны да калгасаў, што плян не прапрацоўваўся ў калгасе.

Ня лепш справа з загатоўкай насеньня. Райкаапсаюз загатовіў усяго 10% пляну па насеньным аўсе і 20%—па ячмені. Райкаапсаюз зусім фармальна аднёсься да арганізацыі абмену насеньня. Ён прымацаваў адны калгасы да другіх, але не пацікавіўся высьвятліць, ці ёсьць гатункове насеньне ў калгасах, да якіх праводзіцца прымацаваньне.

Загатоўка насеньня кармавых, тэхнічных і гародных культур амаль цалкам правалена. Райкаапсаюз лічыць, што пасеўная плошча пад лён будзе цалкам забясьпечана насеньнем, а якова сапраўднае становішча — райкаапсаюз ня ведае. Трэба загатовіць чырвонай канюшыны 363 цэнтн., а загатоўлена 25%; вікі загатоўлена 163 цэнтн., замест 1.200 цэнтн. Амаль нічога ня зроблена ў галіне загатоўкі насеньня кармавых коранплодаў, гародніны і лугавых траў. Гуркоў ёсьць 8 проц. патрэбнасьці, фасолі і бабоў — 5 проц., кармавой моркві — 1 проц. Зусім няма турнэпсу, сталовых буракоў, сталовай моркві, цыбулі. Гэтыя рэшткі насеньня ад мінулага году не выпрабаваны на ўскожасьць і невядома яшчэ наколькі яны прыгодны для насеваў.

Кантрактацыя правых пасеваў 1931 г. не заняла належнага месца ў рабоце райкаапсаюзу. Кампанія па рэалізацыі адозвы партыі і ўраду шырока разгарнулася па раёне. Ёсьць рад сельсаветаў — Ленінскі, Агародніцкі, Ісернскі, Сярэднікаўскі і інш., якія цалкам закантрактавалі свае засевы, але афармленьня кантрактацыі не праводзіцца.

Трэба ў бліжэйшыя-ж дні дабіцца рашучага пералому ў падрыхтоўцы да сяўбы і безадкладна ліквідаваць паказаныя прарывы.

ІВІН.

Зьдзекі кулакоў і апартуніста з батрачак-калгасьніц

БАБРУЙСК (Наш кар.).

У калгасе «НОВЫ БЫТ» (вёска Лешчанка, Бабруйскага раёну) выявіліся агіднейшыя факты скажэньня кіраўніцкам калгасу клясавай лініі.

ПРЫ ПАДТРЫМАНЬНІ СТАРШЫНІ ПРАЎЛЕНЬНЯ КОЛАСАВА Ў КАЛГАС ПРАЛЕЗЛА 8 КУЛАКОЎ, ЯКІЯ ЎСЯКІМ СПОСАБАМ ПРАБАВАЛІ РАЗБУРЫЦЬ КАЛГАС І ТЭРАРЫЗАВАЛІ БАТРАЦКА - БЯДНЯЦКУЮ ЧАСТКУ ЯГО.

КУЛАК ЮРКА МЕЛЬНІКАЎ разам з трыма падкулачнікамі хьдзекваліся з члена калгасу, актыўнай батрачкай ГЛУШАКОВАЙ, У ПАКОЙ, ДЕ ЖЫВЕ ГЛУШАКОВА І ДРУГАЯ КАЛГАСЬНІЦА БАТРАЧКА, ЗЫЎ УВЕДЗЕН ЖАРАБЕЦ СА СЛОВАМІ — «ВОСЬ ВАМ ЖАНІХ».

17 лютага МЕЛЬНІКАЎ ЗЬБІЎ ГЛУШАКОВУ, якая выступала на сходах супроць кулацкіх махінацый.

Аднак, выпазка кулака і падкулачнікаў ня сустрэла адпору. Старшыня калгасу Коласаў аднёсься да ўсяго гэтага, як да жарту.

Коласаў прадаў аднаасобнікам 8 коняй, 6 капёс і 20 будынкаў, а цяпер калгас адчувае вострую патрэбу ў капёсах і будынках.

Коласаў сарваў адпраўку ў горад чырвонага абозу з ільном і збожжам.

СХОД КАЛГАСЬНІКАЎ ПАСТАНАВІЎ ВЫЧЫСЬЦІЦЬ З КАЛГАСУ ЎСІХ 8 КУЛАКОЎ, А КОЛАСАВА ЗЬНЯЦЬ З РАБОТЫ.

Калгасьнікі пічаць што ў адносінах Коласава ГЭТА МЕРА НЕВЫСТАРЧАЛЬНАЯ. Яго справай павінна зацікавіцца РКК. КУЛАЦКІ АГЕНТ ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫЧЫШЧАН З ПАРТЫІ.

А. МАГІДАЎ.

Скарацілі пасеўную плошчу

БАРЫСАЎ. (Наш кар.).

Барысаўскі раён яшчэ не пераключыўся на баявую падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны.

Пляны весьнавой сяўбы ў большасьці сельсаветаў не даведзены да аднаасобных гаспадарак.

Частка калгасаў не прыступіла яшчэ да засыпкі насенных і страхавых фондаў.

Рад калгасаў Барысаўшчыны яшчэ не прыступілі да разьмеркаваньня ўраджаю.

Кіраўніцтва некаторых калгасаў прыступіла да скарачэньня пасеўных заданьняў. Так, апартуністычнае кіраўніцтва калгасаў «13-годзьдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі», імя Чарнякова і «Бядняцкая перамога» дапусьціла значнае скарачэньне пасеўнай плошчы пад кармавымі культурамі і бульбай.

Райком партыі павінен рашуча ўдарыць па канкрэтных посьбітах прапа-апартуністычнай практыкі.

БАРЫСАЎСКІ.

Жлобін зьнізіў тэмпы

ЖЛОБІН. (Наш кар.).

Апошнія пяцідзёўка дае некаторае зьніжэньне тэмпаў падрыхтоўкі да сяўбы і калгасізацыі. У калгасы ўступілі ўсяго адны гаспадарки.

Плян плошчы насеньня выкананы на 80 проц.

Патрабуючае становішча з падрыхтоўкай да сяўбы ў прыгарадных гаспадарках. Замест 1.000 гэкт. адведзена 616. Коняй ёсьць усяго 10 штук. Вызначаныя крэдыты на весьнавую кампанію для прыгарадных гаспадарак не атрыманы. РВК не аказвае належнай дапамогі арганізацыі прыгарадных гаспадарак.

Машніцкі.

Апартуністычная практыка працягваецца

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.).

Некаторыя гомельскія арганізацыі працягваюць апартуністычную практыку былога кіраўніцтва сельскім раёнам. Даволі адзначыць, што з 24 сельсаветаў маюць пляны весьнавой сяўбы толькі 8.

Гомельская калгасасьцкая ня мае ніякіх вестак аб ходзе падрыхтоўкі да сяўбы ў калгасах і арганіз

Чыстка дзяржаўнага апарату

Павярнуць апарат Наркампрацы тварам да вытворчасьці

АЧЫСЬЦІЦЬ ЯГО АД БЮРАКРАТАЎ І АПАРТУНІСТАЎ

Штодзенным рабочым кантролем забясьпечыць бальшавіцкія тэмпы работы наркамату

Пераключыцца на баявыя тэмпы

Праверка работы апарату Наркампрацы выявіла цэлы рад агідных зьявішч. Апарат да гэтага часу нічога не зрабіў для перабудовы сваёй работы. Пытаньням арганізацыі работы, лепшага скарыстаньня кваліфікаванай рабсілы, пармаваньня работы, дапамогі разгортваньню новых сацыялістычных форм і мэтадаў працы зусім не аддавалася ўвагі.

Апарат Наркампрацы не прыстасаваўся да абслугоўваньня раёнаў ласьля ліквідацыі акруг. Работнікі былых акруговых органаў працы былі перакінуты ў іншыя ўстановы, **а раённымі інспэктарамі пасланы непадрыхтаваныя таварышы.** Нават з 8 работнікаў, якія скончылі ў Маскве спэцыяльныя курсы, у органах працы працуе толькі 3. Не арганізаваны курсы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы раённых інспэктароў працы, хаця для гэтай мэты **засталіся нескарыстанымі 30 тысяч рублёў.**

У размеркаваньні функцый паміж асобнымі работнікамі няма ніякай выразнасьці. Інспэктары часта спрачаюцца каму выконваць тую ці іншую работу. Напрыклад, калі трэба было выпрацаваць рэзалюцыю аб адпачынку інспэктар прамысловасьці доўга спрачаўся з інспэктарам культуры аб тым, хто павінен гэтым заняцца.

Да гэтага часу не распрацавана справаздачнасьць райінспэктароў, а таксама паквартальная справаздачнасьць гаспадарчых органаў аб выдаткаваньні сродкаў на ахову працы.

Да рэчы, аб ахове працы. Ня гледзячы на зусім выразныя дырэктывы партыі і ўраду аб поўным і своячасовым скарыстаньні на прадпрыемствах сродкаў, асыгнаваных на ахову працы, **яны скарыстоўваюцца далёка ня поўнасьцю.** Паасобныя прадпрыемствы амаль зусім не скарыстоўвалі гэтых сродкаў. Так, Добруская фабрыка **«Герой працы» ў 1930 г. замест 127 тыс. выдаткавала на ахову працы толькі... 2 тыс.** Дагэтуль яшчэ на запалкавай фабрыцы **«Чырвоная Бярэзіна»** (Барысаў) не ўстаноўлен вэнтылятар, ня гледзячы на шматлікія допісы ў друку.

Зусім не ўпарадкавана справа дзяржнармаваньня заработнай платы. Ёсьць выпадкі, калі **самі органы Наркампрацы парушылі ўстаноўленыя нормы.** Так, Інстытут аховы працы ва ўсіх газэтах надрукаваў абвестку аб прыёме лябаранта, з акладам у 130 руб., у той час, калі стаўка лябаранта паводле дзяржнармаваньня—90 руб.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб адсутнасьці гібкасьці і выразнасьці ў рабоце апарату Наркампрацы, аб адсутнасьці сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Чыстка павінна ўнесьці рашучы пералом у работу Наркампрацы. Трэба поўнасьцю перабудаваць работу, пераключыць яе на сапраўды баявыя тэмпы, адпавядаючыя запатрабаваньням сучаснага пэрыяду сацыялістычнага будаўніцтва.

МАЛІНІН.

„У маёй рабоце нельга праводзіць сацспаборніцтва"

(Ад нашага карэспандэнта)

Зараз праходзіць чыстка апарату **Жлобінскага** раёну і чыгуначнага вузла.

Падрыхтоўка да чысткі з боку партыйнай і прафэсыянальнай арганізацый праводзілася зусім дрэнна. Рабочыя прымалі слабы ўдзел у праверцы работы апарату. Таму ня дзіўна, што і сходы, на якіх праводзіцца пэрсанальная чыстка, таксама імі не наведваюцца. Ужо ў першыя дні чысткі камісія пачынала работу замест 7 гадзіны ў 9 гадзін вечара з прычыны слабай яўкі на сходы.

Чыстка выявіла цэлы рад недахопаў у рабоце чыгуначнага вузла. Начальнік станцыі—**Ціманаў,** прысланы для ліквідацыі прарыву, не хацеў працаваць і ўвесь час дабіваўся пераводу ў іншы горад.

Зразумела, што пры такім настроі ліквідаваць прарыў нельга.

Ціманаў зусім ня прыслухоўваўся да прапаноў рабочых аб паляпшэньні работы станцыі, не наведваў вытворчых нарад.

На запытаньне камісіі па чыстцы аб прычынах дамаганьня пераводу ў другі горад, Ціманаў адказаў:

—Мне трэба перавесьціся ў РСФСР, бо мае дзеці ня могуць вучыцца на беларускай мове.

Гэты адказ варты толькі махровага вялікадзяржаўнага шавініста. **Рабочыя рашуча асудзілі выступленьне Ціманава, кваліфікаваўшы яго, як праяву вялікадзяржаўнага шавінізму.**

Камісія выявіла, што ў апараце вельмі слаба разгорнута сацспаборніцтва. Справавод райкантуры—**Глінская** на запытаньне камісіі—чаму яна ня прымае ўдзелу ў сацспаборніцтве, адказала:

— У маёй рабоце нельга праводзіць сацспаборніцтва (!?).

Чыстка дапаможа перабудаваць работу апарату на новых падставах, адпавядаючых задачам 3-га рашаючага году пяцігодкі.

І. Машніцкі.

Рэгістрацыя фактаў замест практычнай дапамогі

У сувязі з чысткай апарату НКП, лічу патрэбным расказаць аб тым, што мне прыходзілася наглядаць, сутыкаючыся з работнікамі Інстытуту Аховы Працы і мясцовай інспэкцыі працы.

На Эльвод часам прыходзіць супрацоўніца Інстытуту Аховы Працы—тав. **Рубашова.** Акрамя статыстычных даведак, узятых на Эльводзе, нічога прыход яе вытворчасьці не дае. Праўда, такія наведваньні потым вылічваюцца ў бойныя лічбы статыстычнага матар'ялу што «намі абсьледавана столькі прадпрыемстаў» і г. д., але на справе ўсе гэтыя абсьледваньні можна было-б замяніць простай даведкай па тэлефону аб ліку атручваньняў за пэўны пэрыяд часу.

Затое дабіцца канкрэтнай дапамогі ў рабоце ад Інстытуту Аховы Працы вельмі цяжка. Вось ужо 6 год, як Эльвод працуе на току высокай напружанасьці і ніхто з манцёраў нават не знаём з пытаньнем — як падаць першую дапамогу ў выпадку паражэньня элекрычным токам, Інстытут Аховы Працы за ўвесь час ня прыслаў доктара для чытаньня лекцыі на гэту тэму. Калі я зьвярнуўся з гэтай просьбай да т. **Дыхцяра** — дырэктара інстытуту, ён абяцаў прыслаць доктара 14 сьнежня 1930 году. Але гэта абяцанка засталася толькі абяцанкай У інстытуце Аховы Працы лічацца вучастковыя дактары, на прадпрыемствах іх вельмі цяжка убачыць, бо яны іх амаль не наведваюць

Усё гэта кажа за тое, што работнікі інстытуту больш цікавяцца рознымі лічбамі і даведкамі, чым жывой практычнай работай.

Эльвод наведвае інспэктар працы **Саковіч,** але і яго наведваньні ня прыносяць ніякай карысьці. Прыдзе, пагутарыць з адным, з другім, зойдзе ў заўком папросіць талён на абутак— вось і ўся «кансультацыя». У лепшым выпадку ён напіша паперку, што трэба зрабіць тое і тое, ня цікавячыся мэтазгоднасьцю ці магчымасьцю выкананьня гэтага. Як на прыклад, можна ўказаць на патрабаваньне Наркамправы ізаляваць комін для зьніжэньня тэмпэратуры на бункернай плянцоўцы.

Ці вось другі прыклад. Быў выпадак, калі пры рабоце ў пад'ёмніку рабочы, стаяўшы на даху кабінкі, паддягваючы балты, выпусьціў з рук гаечны ключ, якім ударыў працаваўшага ніжэй манцёра. Тав Саковіч, зьявіўшыся на расьследваньне, прапанаваў весьці работу так, каб з пачатку працавалі сьлесары, потым прыступілі-б да працы манцёры, за імі цесьляры, за цесьлярамі каменшчыкі, потым зноў сьлесары і г. д. Адным словам, калі пабудова капітальнай працягваецца больш двух год, дык пры «тэмпах» Саковіча да гэтага тэрміну трэба было-б дадаць яшчэ 10 год, а то і больш.

У мэтах зьніжэньня пералічаных вышэй недахопаў, прапаную для ўвязкі тэорыі з практыкай, інспэктараў працы назначыць хаця-б на 3-6 месяцаў на работу непасрэдна на вытворчасьці ў якасьці загадчыкаў тэхнікай бясьпечнасьці; тады-б інспэктарам Наркампрацы не прапанавалі будаваць будынак, пачынаючы з даху і канчаючы фундамантам

Дубрава.

Ганебны факт

Праверка выкананьня дырэктыў партыі і ўраду—важнейшая ўмова работы кожнай установы. Аднак, у Наркампрацы ня ўсе гэта зразумелі.

Вось характарны факт: інструктар Наркампрацы па рацыяналізацыі і кантролі—тав. **Вайнштэйн** зьвярнуўся да сакратара сэктару кадраў—тав. Касьцюка з мэтай праверкі выкананьня дырэктыў па падрыхтоўцы кадраў.

Загадчык сэктару—тав. **Ермаловіч,** замест дапамогі ў гэтай справе **загадаў тав. Касьцюку ніякіх адказаў тав. Вайнштэйну не даваць і прапанаваў апошняму пакінуць габінэт.**

На гэты ганебны факт ні парт'ячэйка ні мясцком, ні кіраўніцтва НКП не зьвярнулі ўвагі.

П.

ІНСТЫТУТ АХОВЫ ПРАЦЫ НЕ ПАВЯРНУУСЯ ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ

На Інстытут аховы працы ўскладзена вялізарная адказнейшая задача: на аснове навуковых даных **дапамагчы прадпрыемствам правільна арганізаваць работу, палепшыць яе ўмовы і гэтым спрыяць росту прадукцыйнасьці працы.**

Чыстка апарату інстытуту паказала, што ён не спраўляецца з гэтай важнейшай задачай. Інстытут зусім адарваны ад вытворчасьці, не зьяўляецца пачынальнікам у справе разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

І ня дзіўна: як можа інстытут дапамагаць у гэтай справе прадпрыемствам, калі ў яго самога сацспаборніцтва і ўдарніцтва ня сталі настаянным мэтадам работы. **Ва ўсім інстытуце няма ніадного ўдарніка. Самакрытыка зусім не разгорнута. Насьценгазэта працуе зусім дрэнна, ня спрыяе разгортваньню самакрытыкі.**

Апартуністычнай бязьдзейнасьці час пакласьці канец. Заводы і фабрыкі чакаюць канкрэтнай дапамогі ад інстытуту аховы працы. Гэту дапамогу інстытут здолее аказаць толькі пры ўмове поўнай перабудовы сваёй работы, пры пераводзе яе на ўдарныя рэйкі, пры рашучым павароце тварам да вытворчасьці.

ЛЕВІНСОН.

Рабочая праграма

па ільнаводзтве ў калгасах БССР

1) Канчаткова ўстанавіць да 10-га сакавіка г. г. патрэбную колькасьць ільнанасеньня на ўсю плошчу засеву ільну, якая мяркуецца плянам.

2) Да 15-га сакавіка г. г. скончыць абмалот, ачыстку, сартаваньне ўсяго наяўнага ільнанасеньня ў калгасах, скарыстаўшы для гэтага сартоўкі, ільнатрашчоткі, а ў выпадку засьмечанасьці ільнанасеньня ільношкай, прапусьціць праз трыер.

3) Пры недахопе ў калгасе свайго насеньня, не пазьней 15-га сакавіка атрымаць патрэбную колькасьць ільнанасеньня ў забесьпечальных арганізацыях, перавёзшы яго да паказанага тэрміну ў калгасы.

4) Забясьпечыць захаваньне насеньня да сяўбы ў сухім памяшканьні ў раскід пластом ня больш 18 сантымэтраў (4 вяршкі), з рэгулярным правядзеньнем пералапачваньня не радзей аднаго разу ў 5 дзён.

Калі насеньне добра сухое (узяўшы ў жменю яно ня будзе прыліпаць да далоні) хаваньне магчыма дапусьціць у мяшках ці засеках, аднак, пластом ня больш 1-го мэтру.

5) Даглядаць захаванае насеньне вылучыць калгасьніка, які-б сачыў і адказваў за якасьць ільнанасеньня. На вылучанага калгасьніка ўскладзі абавязак праз кожныя 5 дзён паведамляць праўленьню калгасу аб становішчы ільнанасеньня. Акрамя гэтага, у кожным калгасе ўстанавіць брыгадную праверку не радзей аднаго разу ў 10 дзён, для чаго арганізаваць брыгаду са складу калгасьнікаў і калгасьніц.

6) Да пачатку сяўбы і не пазьней 20-га сакавіка зрабіць аналіз насеньня ільну на ўсхожасьць і хваробнасьць, калі не праз адсылку на кантрольную насенную станцыю, то на месцы згодна інструкцыі і паказаньняў агранома.

7) Згодна вытворчага пляну, **не пазьней 20-га сакавіка** перавезьці са складу забесьпечальных арганізацый патрэбную колькасьць штучнага ўгнаеньня. Арганізаваць збор попелу як унутры калгасу, так і за межамі.

Нарыхтаванае штучнае ўгнаеньне і попел захоўваць ў закрытых ад дажджу і сьнегу памяшканьнях да часу яго высеву.

8) Паменіць плошчы пад засеў ільну, забясьпечыўшы ў першую чаргу засеў пасьля матыльковых культур (канюшыны другога году карыстаньня, гароху, вікі, бульбы) і на новаўзораных плошчах (выпанах, на ўзораных сухадолах і лядах).

9) Ворыва глебы пад засеў ільну правесьці раньняй вясной, як толькі прасохне зямля і на глыбіню толькі ворнага пласту.

10) Калі плошча пад лён была ўзорана з восені, то, як толькі яна прасохне, тэрмінова правесьці баранаваньне баранаю «Зіг-Заг».

11) Ворыва глебы пад лён, як вясеньне, так і асеннее праводзіць адзін раз, з паўторным баранаваньнем адзін ці два разы, у залежнасьці ад прарастаньня пустазельля.

12) Штучнае ўгнаеньне патрэбна ўнесьці пад лён у сярэднім за 30-45 дзён да сяўбы як: суперфасфат і калійную соль—за 15-30 дзён, тамашлак і касьляную муку—за 30-45 дзён, попел і сільвініт—за 45 дзён і сульфат-амоні —за 30 дзён.

13) Засеў ільну правесьці раньні—у першай палове мая, сярэдні—у другой палове мая і позьні—у пачатку чэрвеня, але скончыць не пазьней 10 га.

14) Засеў рабіць раскіднымі сяўнікамі з задзелкай ільнанасеньня лёгкаю бараною ў 2 сьляды і на глыбіню 2-х см. на цяжкіх глебах і 3-х см. на лёгкіх.

15) У парадку поўнага на плошчы ад ½ да 1 гэкт. засеў ільну правесьці радковымі сяўнікамі з міжрадзьдзямі 8-10 см., забясьпечыўшы гэты засеў асобным доглядам, уборкаю, расьцілам ці мочкаю і апрацоўкай у мэтах паўнаўшчэньня атрыманых выпікаў з выпікам раскіднога засеву

16) Пры стварэньні ў часе ўсходу на засеях ільну кары абавязкова правесьці баранаваньне затыкам бараны, ці пракатваньне кольчатым катком.

17) У працягу лета абавязкова правесьці ня менш аднаго разу поліва на ўсёй плошчы засеву ільну, праводзячы яго ў часе даўжыні ствала 10-18 см. (2-4 вяршкі) і пры сярэдняй вільготнасьці глебы.

18) Цераблеьне (выбарку) ільну праводзіць толькі ў часе жоўтай сьпеласьці, калі галоўкі пачнуць жаўцець і ⅓ лісьцьця ад нізу са ствала абсыпецца.

19) У мачаніцовых раёнах праз 1-2 дні пасьля цераблеьня абрэзаць галоўкі і салому замачыць ў капанцы (мачыльні), а ў раёнах сланцовых выцераблены лён добра прасушыць на полі ў шатрох (козлах) да канчатковай сьпеласьці насеньня і, зьвёзшы яго ў закрытыя памяшканьні, абчасаць, ці абмалаціць галоўкі і разасласць.

20) У тых раёнах, дзе ільназаводы будуць весьці пераапрацоўку ільнасаломы, пасьля абмалоту галовак безадкладна гэткую вакіраваць заводу, а пры немагчымасьці зрабіць гэта адразу, скласьці яе ў закрытых ад дажджу і сьнегу памяшканьнях; пры адсутнасьці-жа іх—у стагі, згодна спэцыяльнай інструкцыі па кладзе саломы ільну.

21) Рассьціл саломы ільну правесьці не пазьней 20-га верасьня з тым, каб трасту падняць са сьцеліўча не пазьней 1-га лістапада.

22) Месцы для расьсьцілу выбраць роўныя і па мажлівасьці плошчы сенажацяй.

23) Гупчыню рассьцілу рабіць з разьліку 1 гэкт. саломы на 1-1½ гэкт. сьцеліўча ў сярэднім

24) За разасланай саломай ільну ўстанавіць суровы догляд, каб яна не пералежала на сьцеліўчы, ужыўшы абавязкова наступнае: пасьля 2-х тыдняў высланую салому перавярнуць на другі бок і ў залежнасьці ад надвор'я, пачынаючы з 4-га тыдня з часу рассьцілу, браць пробы трасты прыкладна праз 7 дзён. Пробы трэба браць у розных мясцох сьцеліўча невялікімі пучкамі, вагой каля 1 кілё. Узятую пробу трэба прасушыць і зьмяць і калі кастра ад валакна будзе лёгка аддзяляцца, то лён безадкладна трэба падняць са сьцеліўча, прасушыць яго ў бабках і зьвесьці ў закрытыя ад дажджу і сьнегу памяшканьні з наступнай пераапрацоўкай трасты на месцы ці здачай яе бліжэйшаму ільназаводу.

25) Райкалгасаюзы, у раёне якіх будуць ільназаводы, за 10 дзён да пачатку цераблеьня ільну павінны ўказаць кожнаму калгасу, якому заводу, чымільнасаломай ці трастою—лён павінен быць аданы і тэрмін здачы.

26) Разам з арганізацыяй брыгад па выкананьні ўсіх прац у калгасе, **стварыць асобныя брыгады па зборе** і ўборцы ільну з тым, каб за 2 дэкады да пачатку кожнага пэрыяду працы даць ім цьвёрдае заданьне, яны былі-б дэтальна прапрацаваны па кожнай брыгадзе і ўстаноўлен разьмер нормы працы для кожнага калгасьніка ў брыгадзе.

Як правіла, усе работы па ільне павінны выконвацца толькі шляхам зьдзельшчыны, узядзеньня пьвёрдых норм выпрацоўкі, з дэтальным іх абгаварэньнем на брыгадах і агульных сходах калгасьнікаў.

Для выкананьня работ па ільне ў максымальнай меры скарыстаць працу жавчын.

Прадугледзець рабочым плянам патрэбнасьць працадзён па засеве, доглядзе, уборцы і апрацоўцы ільну з дэтальнай прапрацоўкай патрэбнасьці ў іх на кожны пэрыяд працы.

Усю работу па ільнаводзтве арганізаваць мэтадам сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Для павышэньня зацікаўленасьці калгасьнікаў і калгасьніц у лепшай арганізацыі і правядзеньні работы па ільнаводзтве вылучыць спэцыяльныя прэміяльныя фонды ў калгасах.

Старшыня Калгасцэнтру МІЦЬКОЎ.

Да другога пленуму ЦК МОПР'у БССР

Пасьля III Усебеларускага зьезду МОПР'у прайшло тры месяцы. Гэта былі месяцы штурму ірарываў у некаторых гарадзкіх і раёных арганізацыях.

Новае кіраўніцтва ЦК МОПР'у БССР сустрэлася з цэлым радам абураючых фактаў недаацэнкі МОПР'аўскай работы на месцох з боку саміх кіраўнікоў МОПР'аўскіх арганізацый, а таксама з боку некаторых партыйных, камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый. За недаацэнку МОПР'аўскай работы, апартуністычнае кіраўніцтва і адсутнасьць самакрытыкі ў арганізацыі, ЦК МОПР'у БССР распусьціў прэзыдыум Віцебскага гаркому і Барысаўскі райком МОПР'у.

Да другога пленуму ЦК мы прыходзім са значнымі дасягненьнямі. Узьнята дысцыпліна і пэрсанальная адказнасьць кіраўнікоў у большасьці арганізацый МОПР'у. Значна палепшана жывое кіраўніцтва нізавымі арганізацыямі. **Абсьледавана 15 раённых арганізацый. Заслуханы інфармацыі 22 райкомаў аб выкананьні дырэктыў ЦК па розных пытаньнях. З посьпехам праведзена кампанія зімовай дапамогі палітзьняволеным,** якая дала па БССР **79.738 руб.** (кантрольная лічба 75 тыс. руб.). У часе гэтай кампаніі ўступіла ў МОПР 24 тыс. новых членаў. Значна вырасла актыўнасьць працоўных мас у выкананьні сваіх клясавых інтэрнацыянальных задач — дапамогі барацьбітом рэвалюцыі. **На першым месцы па кампаніі зімовай дапамогі ідзе Менск,** які сабраў 23 тыс. руб. Аднак, трэба канстатаваць, што ў гэтай кампаніі прынялі ўдзел толькі 78 проц. арганізацый МОПР'у БССР.

Другі пленум зьбіраецца пасьля 3-га Усесаюзнага зьезду МОПР'у. Пленум вызначыць канкрэтныя задачы і формы ўдзелу мопраўскіх арганізацый у выкананьні плянаў 3-га рашаючага году пяцігодкі і другой бальшавіцкай вясны. Пленум распрацуе канкрэтныя мерапрыемствы па прыстасаваньні работы мопраўскіх арганізацый да ўмоў летняга пэрыяду.

Пленум павінен прыцягнуць да сябе ўвагу шырокіх мас працоўных і асабліва мопраўскага актыву.

Г.

Паведамленьні

СЁНЬНЯ:

— **Дом Камасьветы.** У 19 гадз.—групавая кансультацыя для дакамвузьнікаў і т. т., што займаюцца самаадукацыяй па геаграфіі і беларускай мове. У канц. Дому штодзённа з 17-20 гадз. праводзіцца перарэгістрацыя членаў ТВМД і прыём.

— **Дом Асьветы.** У 19 гадз.—заняткі камсамольскага калектыву на падрыхтоўцы да палітбою. У 19 гадз.—агульны сход асьветнікаў г. Менску. У парадку дня—вынікі 3-га Усебеларускага настаўніцкага зьезду (працят).

— **БДУ.** У 20 гадз., у гал. корп., пак. 302, — пасяджэньне катэдры сав. буд. і права БАН. У парадку дня — даклад т. Мар'ясінай: «Злачынствы на нацыянальнай глебе ў БССР». Запрашаюцца практычныя працаўнікі сав. установаў, навук. працаўнікі і студэнты. Уваход вольны.

— **Культпроп Менгаркому КП(б)Б** паведамляе ўсіх слухачоў партыйных школ і курсаў партактыву аб тым, што заняткі ў партыйных школах 8-га сакавіка адмяняюцца ў сьвязку з сьвяткаваньнем Міжнароднага дня жанчын — 8-га сакавіка. Наступныя заняткі адбудуцца 9-га сакавіка ў вызначаныя гадзіны.

— Сёньня 5-III г. г., у 19 гадз., у памяшканьні **клюбу саўгандальслужачых** (вул. Энгельса) гарсавет Асоавіяхіму склікае **агульна-гарадзкі сход актыву Асоавіяхіму** (сакратароў яч. Асоавіяхіму і членаў бюро). Парадак дня: 1) Вынікі 2-га зьезду Асоавіяхіму і задачы гарадзкой арганізацыі. 2) Мастацкая частка. Яўка сакратароў в усім складам бюро абавязкова.

— **Парттройка гар. КК выклікае на сёньня, 5-III, у 6 з пал. гадз. веч. (Энгельса № 28, 2-гі паверх) наступных т.т.:** Пікуса, Чэрніка і Кавалеўскага (спэлеры ф-ка), Гарбунова (Белрыба), Кантаровіча (Уцільскур), Шапіра і Левіна (з-д «Полымя рэвалюцыі»), Голанда і Язерскага (Будінстытут), Александровіч і Біох (шклозавод), Камена (Калвасцэнтр), Асіповіча (БСІКА), Машкова (Наркамзем), Манцукевіча (МБВ чыг.), Гельмановіча (абутк. майст.), Арлоўскага (з-д «Энергія»), Даніловіча (2-я сав. б-ца), Мікуліча А. В. для ўдзелу ў разглядзе іх справы. Таксама выклікаюцца сакратары ячэек, дзе гэтыя таварышы лічацца на ўчоце.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная контора Менск, Савецкая, 73.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	4-27	Сэктар сец. земл.	6-19
Сакратар	10-74	Сант. саўсуд.	6-19
Партсэктар	13-80	Замеш. інфарм.	6-19
Прам. сэктар	13-80	Начны рэдактар	6-42

Прыём телефонограм і тэлеграмных перадач 10-74

Умовы падпіскі
(з дарэвоцным дадаткам „Для всех")

На 1 мес.	1 р.
„ 3 мес.	3 „
„ 6 мес.	6 „
„ 12 мес.	12 „

Падпіска прымаецца ўсюды і заўсёды.

Плата за абвесткі:

За радок нонп. пасьля тэксту 1 р., перад гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Пасьля тэксту—у два разы дарожэй. Калгасаўскіх рахункаў выдавецтва № 52|10550 у Дзяржбанку

Абвесткі прымаюцца ў канторах выдавецтва „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 73, 2-гі паверх тэл. 7-31.

БЕЛ. АДДЗ. САФІЛУ | Белдзяржтэатр | СЁНЬНЯ 5 сакавіка

ВЯЛІКІ СЫМФАНІЧНЫ КАНЦЭРТ
ПАД КІРАЎНІЦТВАМ
Р. МОХАУПТА (Бэрлін) | Р. ГОТЛІБ (скрыпка) (Вена).
Білеты прадаюцца ў касе тэатру з 12—2 і з 5 гадз. веч.
—) ПАЧАТАК—у 9 гадз. веч. (—

кіно „Юны Піянэр" — Ад чацьвярга, 5 сакавіка
2 фільмы ў адзін вэчар 2
1) ПАХОД КРАСІНА
ў 6 частках,
2) Піянэрскі паход
Культурфільм у 1 частцы.
Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня
Каса—з 12 гадз.

Кіно-тэатр „Культура" — Новы савецкі фільм вытворчасьці Дзяржкінпрам Грузіі
ВЕЛЬМІ ПРОСТА
драма ў 6 частках.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ гастр. муз. сатыр.
Гарына і Славянскага (БІМ-БОМ)
Пачатак: 7 г., 8 г. 45 м., і 10 г. 30 м.
КАСА—з 5 гадз.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Новы амэрыканскі прыгодн. фільм
У СЬЛЕД
Звыш праграмы
кіно-хроніка Саюзкіно № 4
Пач.—у 6 г., 7 г. 30 м., 9 і 10 г. 30 м.
Каса з 4 з пал. гадз.

КІНО „Інтэрнацыянал" — Сав. фільм вытв. „Межрабпомфільм"
Дзяўчынка со скрынкай
камэдыя ў 6 част.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ навіласьветфільм
КАРОЗАМ.
Пач. 1 сэансу ў 6 г.—Каса—з 4 г. 30 м.

КІНО „Пралетары" — Сав. фільм вытв. „Межрабпомфільм" драма ў 6 част.
БЕЛЫ АРОЛ
ЗВЫШ ПРАГР.—палітэсьветфільм
Чырвоная маланка.
Пачат. ў 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., і 10 г. 30 м.
Каса адкрыта—з 4 гадз.

КІНО „СПАРТАК" — 2-гі тыдзень нашумеўш. фільм
НАПОЛЕОН-ГАЗ
ў 7 частках.
Пачатак у 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м.
КАСА з—5 гадз.

Даводзіцца да ведама студэнтаў «ВЗИНО», што Беларускі філіял і кансультацыйнае бюро
ПЕРАМЯСЬЦІЛІСЯ
з памяшканьня НКФ БССР
на Савецкую вул., № 59,
2-гі паверх.

Усебеларуская кантора Дзяржбанку
склікае сёньня, 5 сакавіка, у 7 г. веч.,
у памяшк. канторы Дзяржбанку,
нараду плянавых і БУХГАЛЬТАРСКІХ РАБОТНІКАЎ
кліентуры банку,
З наступным парадкам дня:
1) Аб правядзеньні ў жыцьцё пастановы СНК СССР аб мерах па паляпшэньні практыкі крэдытнай рэформы.
2) Аб складаньні 2-га варыянту крэдытнага пляну на 2-гі квартал.
Яўка неабходна без спазьненьня.
ДЗЯРЖБАНК.

8 сакавіка, у 6 з пал. гадз. веч., у памяшк. клюбу харчавікоў адбудзецца
ЎРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ
плепуму Менгаркому КП(б)Б сумесна з ЦСПСБ,
прысьвечанае Міжнароднаму камуністычнаму дню работніц—8 сакавіка.
Члены і кандыдаты гаркому, ЦСПСБ і гарсавету праходзяць па сваіх мандатах.
На пленум запрашаюцца дэлегаты і актыў г. Менску.
Сакратарам партаддзелаў і ячэек КП(б)Б прапануецца атрымаць білеты ў гаркоме КП(б)Б, пачынаючы 5 сакавіка (пакой № 10 з 10 гадз. рана да 4 гадзін дня).
Менгарком КП(б)Б і ЦСПСБ.

ВІЦЕБСКІ ДЗЕННЫ РАБФАК пры вэтінстытуце
АБВЯШЧАЕ
ВЕСНАВЫ НАБОР СТУДЭНТАЎ
на 1-шы і 3-ці курсы на 30 асоб.
Прыём заяў да 20 сакавіка.
Іспыты адбудуцца 25 і 26 сакавіка. Пачатак заняткаў—1 красавіка.
Прымаюцца рабочыя, калгаснікі, беднякі і сярэднякі.
На 1-шы курс патрэбны веды ў абъёме 4-х груп сямігодкі, а на 3-ці курс—у абъёме поўнай сямігодкі Прыёмовыя іспыты праходзяць усе паступаючыя.
Дакументы, патрэбныя згодна даведніка НКП на 1930-31 навучальны год, пасылоюцца ў канцылярыю рабфаку Віцебск, Валадарскага, 72-17.
Камандыроўкі ад НКП не патрэбны, а патрэбна характарыстыка ад мясцовых арганізацый.
Студэнты рабфаку забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.

Кошт публікацыі аб згубе 1 р. 1 дакументу

Для здачы абвесткі у газэту „ЗЬВЯЗДА" звяніце па тэл. 7-81

6-га сакавіка, у 6 гадзін. веч., у Доме пісьменьніка адбудзецца
першая Ўсебеларуская сэзнарная нарада
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Рэканструкцыя Савецкага кіно і пэрспэктывы разьвіцьця беларускай савецкай кінематаграфіі—дакл. т. РАМАНЧУК.
2. Уцягненьне беларускіх пісьменьнікаў і рабкораў у кінематаграфію і заклік рабочых-ударнікаў на літаратурную работу ў кіно—дакл. т т. БРАДЗІНСКІ і АЛЕКСАНДРОВІЧ.
3. Тэматычны план Белдзяржкіно на 1931 г. і шляхі яго рэалізацыі—дакл. тав. ЦІВУНЧЫК.
6-га сакавіка, у 5 гадз., у Доме пісьменьніка адбудзецца
ПАСЯДЖЭНЬНЕ ФРАКЦЫІ членаў і кандыдатаў КП(б)Б і ЛКСМБ.
АРГКАМІСІЯ.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА. СЭКТАР КІНІГАРАСПАЎСЮДЖАНЬНЯ
ДА МІЖНАРОДНАГА ЖАНОЧАГА ДНЯ
ВЫХОДЗІЦЬ З ДРУКУ.
НЮРЫНА. Работніца і сялянка кіруе краінай.
Продаж будзе праводзіцца ва ўсіх кнігарнях БДВ, спажыўкаапэрацыі і саюздруку.

ГОМЕЛЬСКІ ТЭХНІКУМ САМАТУЖН. ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ
абвяшчае
веснавы набор студэнтаў
на аддзяленьні;
1. ДРЭВААПРАЦОВАЧНАЕ.
2. КЕРАМІЧНАЕ.
3. ЛЕСАХЭМІЧНАЕ.
Заявы прымаюцца да 20-га сакавіка ў канцылярыі тэхнікуму, Ветраная № 50.

6-га лютага г. г. у 7 гадзін вечара ў клюбе „МЭДПРАЦАЎНІК" склікаецца
СХОД АПТЭЧНЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ
сумесна з рабочымі брыгадамі і работнікамі в прадпрыемствах па чыстцы апарату Белаптэкакіраўніцтва.
У парадку дня: справаздача аб дзейнасьці Белаптэкакіраўніцтва.
Камісія ЦКК РСІ па чыстцы апарату Белаптэкакіраўніцтва

Беларускай канторы „САЮЗХЛЕБ"
ПАТРАБУЮЦЦА БУХГАЛЬТАРЫ І ПАМБУХІ
НА ВЯЧЭРНЮЮ РАБОТУ.
Аплата па згодзе.
Зварачацца да галоўбуха на тэл. 3-17, або па адрасе. Біржавы завулак, 1.
Белінтэрнатора «Саюзхлеб».

Дайце правільныя адрасы!
Ніжэйпаказаныя падпісчыкі не атрымліваюць газэты „ЗЬВЯЗДА", з прычыны няправільных адрасоў:
Савінскі—Сав цная, 82—9, Ніжанаў Іван—Разінская, 110—1, Голуб—Правізянская, 101-19—1, Крышкевіч—Старо-Камароўская, 26—1, Марутневіч—Р. Люксембург, 21 а, Мазуровіч—Рэспубліканская, 2а, кв. 8, Рабчынскі—Талстога, 13—1, Мазуркевіч—Берасьцянская, 7—1, Пашчывіч—Інтэрнаціянальная, 5—1, Менін Іц.-Сарэўская, 10,2, Вілкавіч—Глухая, 9—1, Тэйцін М. Ю.—Слонімская, 43—1, Каган—Маскоўская, 47—11, Шыцко—Старо-Віленская, 4, 65, кв. 1, Мінкевіч—Разінская, 56—1, Пэўзнер—Базарная.
Просьба да названых падпісчыкаў паведаміць у газэтнае бюро (Ленінская, 34, тэл. 15-42) свой дакладны адрас.

УМОВЫ ПРЫЁМУ

на завочныя радыё-курсы кіруючага партактыву раёнаў

1. Завочныя радыё-курсы партактыву зьяўляюцца масавай формай завочнага навучаньня і маюць мэтай павысіць палітычны ўзровень членаў партыі, вядучых кіруючую партыйную, савецкую, прафэсыйную, каапэрацыйна-гаспадарчую працу ў раённым маштабе, або ў маштабе фабрычна-заводзкага камітэту і буйна-вытворчай калгаснай ячэйкі, а таксама даць ім арганізацыйна-практычную падрыхтоўку і перападрыхтоўку.

2. Навучаньне на завочных радыё-курсах разьлічана на 27 дэкад з сярэдняй нагрузкай (10 гадзін у дэкаду), з якіх 5 гадзін адводзіцца на слуханьне радыё-лекцый па вучэбных дысцыплінах, а 5 гадзін для самастойнай апрацоўкі друкаванага матар'ялу, маюча з адносіны да зьместу радыё лекцый.

Для актыўна-працуючых завочнікаў рады-курсаў арганізуюцца ў канцы навучальнага году падагульняючыя 2-х дэкадныя канфэрэнцыі пры апорных кансультацыйных пунктах. На падагульняючыя канфэрэнцыі выклікаюцца толькі тыя з завочнікаў, якія праслухалі і прапрацоўвалі ўстаноўленую колькасьць радыё-лекцый.

3. На завочныя радыё-курсы прымаюцца:

а) члены партыі, вядучыя кіруючую працу ў партыйных, прафэсыйных, савецкіх і каапэрацыйна-гаспадарчых установах і арганізацыях раённага маштабу;

б) сакратары і члены фабрычна-заводзкіх камітэтаў КП(б)Б і буйных фабрычна-заводзкіх і саўгасна-калгасных ячэек;

в) члены КП(б)Б — дырэктары фабрык і завода